Гос. Пуб. Биб-ка Уз.С.С.Р.

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МККП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 28 (6004) | 4 лютага 1938 г., пятніца | ЦАНА 10 КАП.

ТАВАРЫШУ ГРЫГОРЫЮ ІВАНАВІЧУ ПЕТРОЎСКАМУ

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Совет Народных Камісараў Саюза ССР у дзень Вашага шасцідзесяцігоддзя шлюць Вам, — старому большэвіку з гвардыі Леніна — сваё гарачае прывітанне.

Звыш 40 год свайго жыцця Вы аддалі справе рабочага класа і сялянства. Ваша большэвіцкая работа ў падполлі і ў дзяржаўнай думе, Ваша адданасць партыі Леніна — Сталіна і пастаянная сувязь і абшчэнне з шырокімі масамі рабочых і сялян, Ваш вялікі жыццёвы вопыт і доўгалетняя работа на пасту старшыні ЦВК Украінскай ССР—заваявалі Вам давер'е і павагу шырокіх народных мас Совецкага Саюза.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) і Совет Народных Камісараў Саюза ССР жадаюць Вам яшчэ на доўгія годы захаваць здароўе і бадзёрасць для далейшай пладатворнай работы на карысць украінскага народа і народаў усяго Совецкага Саюза.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б).
Совет Народных Камісараў Саюза ССР.

ПРЫВІТАННЕ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР тав. ПЕТРОЎСКАМУ Г. І. У СУВЯЗІ З ЯГО ШАСЦІДЗЕСЯЦІГОДДЗЕМ

Дарагі Грыгорый Іванавіч!

У дзень Вашага шасцідзесяцігоддзя Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР шле вам гарачае прывітанне.

Больш сарака год Вашага жыцця прайшлі ў нястомнай барацьбе за справу партыі Леніна—Сталіна. Ваша жыццё барацьбіта-рэволюцыянера, жыццё дзяржаўнага дзеяча заўсёды было напоўнена нястомнай энергіяй большэвіка, аддаючага ўсе свае сілы на карысць народа.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР жадае Вам многіх-многіх год пладатворнай работы на карысць соцыялістычнай радзімы.

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ ПРАВЯДЗЕМ ЛЕСАЗАГАТОЎКІ!

Лесазагатоўчая прамысловасць БССР уступіла ў першы год трэцяй сталінскай пяцігодкі з далёка неўпяшальнымі вынікамі. Больш аднаго мільёна кубаметраў лесу недадаў краіне ў 1937 годзе Наркамлес Беларусі. Рэзультаты студзеня сведчаць, што і ў 1938 годзе прадаўжаецца ганебнае адставанне лесазагатоўчых работ. Буйнейшыя леспрамгасы Беларусі — Асіпавіцкі, Барысаўскі, Уздзенскі, Слуцкі, Бабруйскі, Глускі і іншыя—знаходзяцца ў глыбокім прарыве.

Квартальны план у студзені па ўсёй сістэме Лесбела выканан па загатоўках на 31,4 проц., а па вывазцы на 27,1 проц.

Некаторыя работнікі трэста задаволены гэтымі лічбамі, лічаць іх зусім дастатковымі, супакойваюць сябе рэзультатамі работы, распаўсюджваючы гэтыя нездаровыя настроі і сярод некаторых кіраўнікоў леспрамгасаў. Людзі забываюць, што студзень і люты найбольш спрыяючыя месяцы года для правядзення лясных работ, што гэтыя месяцы па сутнасці рашаюць поспех выканання ўсяго гадавога плана, і калі студзень даў такое мізэрнае выкананне, то ўвесь пяжар квартальнага плана палае на люты.

Адставанне лесазагатоўчай прамысловасці БССР тым больш недаравальна, калі ўлічыць выключна вялікую ўвагу і дапамогу ёй, якую аказваюць партыя і ўрад. У 1938 годзе план лесазагатовак у БССР значна зменшан супроць мінулага года, у той-жа час матэрыяльна-тэхнічная база безупынна расце. Аўтамабільны і трактарны парк папаўняецца ўсё новымі дзесяткамі машын.

З дазволу ЦК ВКП(б) з заўтрашняга дня ў БССР пачынаецца стаханаўскі месячнік загатовак і вывазкі лесу. На працягу месячніка павінен быць поўнасцю выканан квартальны план. Для поспеху месячніка патрабуецца ад кіраўнікоў Наркамлеса, трэста, леспрамгасаў, раённых партыйных і совецкіх арганізацый сапраўды большэвіцкай арганізацыі справы, аператыўнага кіраўніцтва ходам работ.

У чым прычына выключна ганебнага становішча з загатоўкамі і вывазкай лесу?

Асноўная прычына ў тым, што некаторыя кіраўнікі лесазагатоўчай прамысловасці забыліся аб люцях, рашаючых поспех выканання зытворчай задачы. Гэтыя кіраўнікі не зразумелі яшчэ той велізарнай адказнасці, якую яны нясуць перад партыяй і ўрадам за бесперабойнае снабжэнне народнай гаспадаркі лясными матэрыяламі.

Правільная арганізацыя працы лесаруба, трактарыста, шофера, возчыка — важнейшая ўмова выканання плана. Але на жаль, гэтым пытаннем ніхто не займаецца. Начальнікі лесаўчасткаў з благаслаўлення Наркамлеса і трэста ператварыліся ў вузкіх адміністратараў. Яны не цікавяцца расстаноўкай рабочай сілы, арганізацыяй вытворчага працэса, правільным скарыстаннем механізмаў. Карапей кажучы, яны не займаюцца іменна тым, што з'яўляецца іх непасрэдным абавязкам.

На адбыўшайся 2 лютага ў промаддзеле ЦК КП(б)Б нарадзе ад хозяе лесазагатовак прыводзіліся анекдатычныя факты. Начальнік Чырвонапольскага лесаўчастка (чэрыкаўскі леспрамгас) тав. Раманенка на працягу месяца не выязджаў на лясныя распрацоўкі, «кіруючы» лесазагатоўкамі са свайго кабінета. Пасля гэтага не дзіва, што яго ўчастак знаходзіцца ў глыбокім прарыве.

У нялоўкім становішчы апынуўся начальнік Лубяніцкага лесаўчастка Быхаўскага раёна тав. Хадановіч, калі ўпаўнаважаны ЦК КП(б)Б прапанаваў яму выехаць з ім на ўчастак. Тав. Хадановіч быў вымушан запрасіць з сабой другога работніка, каб той паказаў яму ўчастак, у якім, як відаць, ён бывае вельмі рэдкім госцем.

Усё гэта ў дастатковай ступені сведчыць аб тым канцылярска-бюракратычным стылі кіраўніцтва, які пануе ў лясных арганізацыях Беларусі, пачынаючы ад наркамата і канчаючы лесаўчасткам.

Як здома, ворагі народа многа нашкодзілі і ў лясной прамысловасці. Яны зрывалі вярбоўку рабочай сілы, яны рабілі ўсё, каб падарваць механічныя і транспартныя базы леспрамгасаў. Многа шкодніцкіх гнёздаў выкрыта і выкарчавана. Задача заключаецца ў тым, каб да канца выкарчаваць астаўшыхся ворагаў, хутка і рашуча ліквідаваць вынікі шкодніцтва. Варт пакончыць з шматлікімі аварыямі аўтатранспарта і механізмаў. Пара ліквідаваць іх прастоі. На Слуцкім механпункце, напрыклад, з 18 газагенератараў працуе толькі 5, астатнія стаяць з-за адсутнасці некаторых дробных дэталяў, якія лёгка набыць. Але нікога гэта не трывожыць.

Кіраўнікам лясной прамыслозасці трэба скарыстаць указанні Л. М. Кагановіча ў загадзе аб выкананні плана 1938 года па Наркамцяжпрому. Трэба дабіцца, каб работа ішла па цвёрдаму раскладу, які прадугледжвае заданні для кожнага ўчастка.

Важнейшай умовай выканання плана з'яўляецца масавы выхад рабочай і гужавой сілы ў лес. Для таго, каб гэтага дасягнуць, патрэбна правядзенне ашаведнай масава-палітычнай работы сярод насельніцтва. Але якраз гэтага і няма.

Лесазагатоўчым арганізацыям у радзе месц не дапамагаюць раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі. Яны забываюць аб адказнасці за выкананне плана загатовак і вывазкі лесу, якую нясуць не толькі загатоўчыя арганізацыі.

Там, дзе кіраўнікі леспрамгасаў і раённых арганізацый спусціліся ў калгасы, растлумачылі палітычнае і народнагаспадарчае значэнне лесазагатовак, там мы маем пэўныя поспехі. У Горацкім раёне калгасы «Перамога», «Верны шлях» і «Рассвет», у Клічаўскім раёне калгас «Чырвоны май» і інш. выканалі дагэрмінова — 1 лютага — свае квартальныя планы лясных работ. Але гэта пакуль адзінкавыя факты. У некаторых-жа месцах проста сабатуецца выкананне гэтага важнейшага дзяржаўнага задання.

У Быхаўскім раёне райком партыі і райвыканком абмежаваліся тым, што вылучылі ўпаўнаважаных па лесазагатоўках, не праверыўшы, як працуюць гэтыя ўпаўнаважаныя. А яны, як аказалася, нават не выязджалі.

Кіраўнікі Чэрыкаўскага раёна абавязаліся выканаць квартальны план да 25 студзеня, але нічога канкрэтнага не зрабілі для выканання свайго абавязацельства. У рэзультаце да гэтага часа план быў выканан толькі каля 25 проц.

Поспех лесазагатовак рашаюць таксама культурна-бытавыя і матэрыяльныя ўмовы для кадраў работнікаў лесу. На жаль, у гэтай справе зельмі многа недахопаў. Нярэдкі выпадкі, калі ў лес месяцамі не дастаўляюцца газеты, ніякай масавай работы там не праводзіцца. Профсаюз рабочых леса і сплава бяздзейнічае. Яго работнікаў у лесе не відаць. Вялікая вакханалія з нормамі і распэнкамі. Аб гэтым паступае многа сігналаў у Наркамлес і ў БРК саюза, але яны рэагавання не знаходзяць. Няма патрэбных клопатаў аб кадрах: у інтэрнатах беспарадак і антысанітарыя. Белкаапсаюз самаўхіліўся ад абслугоўвання лесарубаў і возчыкаў. Ён не падвозіць тавараў да месц масавага скаплення работнікаў лесу.

Стаханаўскі рух у лесе разгорнут вельмі слаба. Ніхто гэтай спразай не кіруе: ні ў Наркамлесе, ні ў трэсце, ні на месцах. Ёсць многа зыдатных стаханаўцаў: В. Лыза, які выконвае норму на 341 проц., М. Бондар — на 340 проц., Ільнічык — на 325 проц. і рад іншых. Але вопыт перадавых не распаўсюджваецца.

Стаханаўскі месячнік, які заўтра пачынаецца, патрабуе карэнных змен у адносінах да арганізацыі стаханаўскага руху з боку лясных арганізацый. Стаханаўскі рух павінен знайсці шырокі размах у лесазагатоўчай прамысловасці.

Задача заключаецца ў тым, каб стварыць умовы кожнаму работніку лесу працаваць па-стаханаўску. Поспех месячніка будзе забяспечан тады, калі па-большэвіцку будзе арганізавана кіраўніцтва стаханаўскім рухам.

Работнікі лесазагатоўчай прамыслозасці БССР, кіраўнікі раённых партыйных і совецкіх арганізацый трымаюць экзамен перад краінай на здольнасць выканаць адказнейшае заданне партыі і ўрада. Рэспубліканскі і раённы друк павінен аказаць дапамогу ў правядзенні месячніка.

Заўтра першы дзень стаханаўскага месячніка ў лесе. Кожны яго дзень павінен быць правядзен па-баявому, сапраўды пастаханаўску. Арганізаванасць, чоткасць і аператыўнасць кіраўніцтва — неадменныя ўмовы перамогі.

ШТОРМ УЦІХАЕ

МЕТЭАЗВОДКІ З ДРЭЙФУЮЧАЙ КРЫГІ

МАСКВА, 3 лютага. У пяжкіх умовах адважная чацвёрка совецкіх палярнікаў не траціць мужнасці. Размёстанцыя «Паўночны полюс», якая размясцілася на абломку крыгі, акружанай драбячыміся лёдавымі палямі, як і ў звычайныя дні, кожныя шэсць гадзін перадае свету метэаралагічныя нагляданні.

2 лютага ў 18 гадзін, ледзь паспеўшы перабрацца на новы абломак крыгі, папанінцы перадаюць чарговую метэазводку: «Імжа, туман, паўночна-ўсходні вецер сілай у два балы, тэмпература 11 градусаў марозу».

Праз шэсць гадзін новая метэазводка: «Тэмпература ў раёне станцыі знижаецца — 14 градусаў марозу».

Наступнае паведамленне ў 6 гадзін раніцы 3 лютага: «Тэмпература 16 градусаў марозу, вецер паўночна-паўночна-ўсходні сілай у два балы». У 12 гадзін дня адважныя палярнікі зноў радыруюць: «Каардынаты станцыі — 74 градусы 3 мінуты паўночнай шыраты і 16 градусаў 30 мінут заходняй даўгаты. У раёне станцыі — невялікая воблачнасць, вецер паўночна-паўночна-заходні, тэмпература 18 градусаў марозу».

Апошнія паведамленні, атрыманыя ад тав. Папаніна, гаворыць аб тым, што шторм у Грэнландскім моры ўціхае.

Гераічныя папанінцы не спыняюць сваёй пладатворнай работы.

***

МУРМАНСК, 3 лютага. (БЕЛТА). Сёння ў 2 гадзіны дня ледакол «Таймыр» выйшаў у мора.

Перад адыходам судна ў парту адбыўся мітынг. Кіраўнік аперацыі на «Таймыре» тав. Остальпаў і капітан карабля таз. Барсукоў, выступаўшыя на мітынгу, заявілі, што экіпаж ганарыцца ўскладзенай на яго задачай — знаць герояў-папанінцаў з крыгі і прыкласці ўсе намаганні, каб выканаць гэту задачу з гонарам.

ПАСЯДЖЭННЕ ІСПАНСКАГА ПАРЛАМЕНТА

БАРСЕЛОНА, 2 лютага. (БЕЛТА). Учора ў былым манастыры Монсерат (за 50 кіламетраў ад Барселоны) адбылося пасяджэнне картэсаў (парламента іспанскай рэспублікі). Месца для пасяджэння картэсаў па-за Барселонай было выбрана для таго, каб засцерагчы членаў картэсаў, гасцей і насельніцтва сталіцы ад бамбардыроўкі з боку фашыстаў. З гэтай мэтай было абвешчана нават, што пасяджэнне картэсаў наогул не адбудзецца, у той час як дэпутаты накіроўваліся ў Монсерат.

На пасяджэнне прыбыла велізарная большасць дэпутатаў — членаў партыі народнага фронта, а таксама дэпутаты цэнтра і некаторыя былыя міністры Іспаніі і замежныя госці.

Адкрываючы пасяджэнне, старшыня картэсаў Мартынес Барыо агаласіў тэлеграму з прывітаннем картэсам і выражэннем абурэння па поваду бамбардыроўкі фашыстамі гарадоў Іспаніі, падпісаную 60 членамі кангрэса ЗША. З'яўленне ў зале пасяджэння ўрада рэспублікі члены картэсаў сустрэлі бурнай авацыяй.

Глава ўрада Іспанскай рэспублікі Негрын у сваёй прамове падкрэсліў, што вайна можа закончыцца толькі перамогай без якіх-небудзь кампрамісаў. Закранаючы пытанні знешняй палітыкі, Негрын падкрэсліў вернасць Іспаніі Лізе нацый і заявіў, што агрэсія, аб'ектам якой з'яўляецца рэспубліканская Іспанія, прадстаўляе пагрозу справе ўсеагульнага міру.

У канцы сваёй прамовы Негрын выкрыў манеўры мяцежнікаў, якія прабуюць пашырыць чуткі аб блізкім міры з мэтаю пахіснуць цвёрдасць рэспубліканскага тылу. Урад рэспубліканскай Іспаніі, сказаў Негрын, не зробіць ні аднаго кроку, які-б ішоў на шкоду нацыянальнай і эканамічнай незалежнасці краіны.

Ад імя комуністычнай партыі Іспаніі на пасяджэнні картэсаў выступіла Далорэс Ібаруры. Яна заявіла, што компартыя заўсёды падтрымлівала ўрад народнага фронта, і адзначыла вялікія поспехі ўрада, што выразілася ў арганізацыі народнай арміі, у росце рэзерваў і паляпшэнні палітычнай падрыхтоўкі байцоў, у якой галоўную ролю адыгралі камісары. Гэтыя поспехі прывялі да ўзяцця Тэруэля і адыграюць рашаючую ролю ў барацьбе.

Ібаруры вітала пвёрдую пазіцыю ўрада, які не ідзе ні на якія кампрамісы з мяцежнікамі; яна падкрэсліла, што вайна можа скончыцца толькі поўным знішчэннем фашыстаў. Палітыка ўрада, заявіла Ібаруры, патрабуе ўсё большага падтрымання народных мас. Компартыя зварачае асаблівую ўвагу на арганізацыю і развіццё ваеннай прамысловасці. У той час як Германія і Італія забяспечваюць Франко боепрыпасамі і зброяй, іспанскі народ пазбаўлен права набываць за граніцай тое, што яму неабходна. Таму ўрад павінен забяспечыць умовы развіцця абароннай прамысловасці.

Пасіянарыя адзначыла далей, што сардэчнае супрацоўніцтва цэнтральнага ўрада і ўрада Каталоніі з'яўляецца станоўчым фактарам, які комуністы вітаюць, спадзеючыся, што гэта супрацоўніцтва будзе з кожным днём узмацняцца. Компартыя, заявіла Пасіянарыя, цвёрда верыць у народны фронт, які будзе яшчэ мацней, калі ў яго ўвойдуць масы, аб'яднаныя Нацыянальнай канфедэрацыяй працы. Народны фронт — гэта адзінства, і компартыя змагаецца за адзінства рабочага класа, народных мас і ўсіх народнасцей Іспаніі.

Далей з прамовамі аб безагаворачным патрымманні ўрада выступілі каталонскія дэпутаты, прадстаўнікі Краіны басканў і рад дэпутатаў картэсаў — членаў розных палітычных партый.

У прынятай рэзалюцыі дэпутаты картэсаў аднагалосна выказалі давер'е ўраду народнага фронта.

***

БАРСЕЛОНА, 2 лютага. (БЕЛТА). Картэсы (парламент) аднагалосна прынялі на сваім пасяджэнні дзве рэзалюцыі. У першай рэзалюцыі гаворыцца:

«Картэсы прымаюць да ведама заяву главы ўрада і выказваюць сваё глыбокае задаволенне работай урада, ажыццёўленай за час перапынку парламенцкай дзейнасці. вітаюць урад з дасягнутымі ваеннымі поспехамі і рэарганізацыяй дэпартаментаў; пацвярджаюць поўнае давер'е ўраду, ушаноўваючы яго прадаўжаць узятую лінію і дабіцца пераможнага сканчэння вайны. Картэсы пастанаўляюць перапыніць сесію да новага склікання».

Другая рэзалюцыя гласіць:

«Картэсы вітаюць сухапутныя, марскія і паветраныя сілы рэспублікі, заслугоўваючыя вечнай удзячнасці радзімы. Картэсы з задаволеннем адзначаюць, што нацыянальная незалежнасць і палітычны суверэнітэт краіны знайшлі ў асобе храбрых і дысцыплінаваных салдат народа, у асобе камандзіраў і камісараў а таксама ў найбольш кваліфікаваных прадстаўнікоў арміі неабходную рэспублікі дзейсную сілу».

ВОДГУКІ ЗАМЕЖНАГА ДРУКУ НА ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ЛІТВІНАВА Ў „КАМІТЭЦЕ 28-мі"

ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 2 лютага. (БЕЛТА). Газеты спыняюцца на выступленні совецкага дэлегата тав. Літвінава ў «Камітэце 28-мі».

Газета «Эвр» піша: «Літвінаў паказаў, што без прымусовых мер Ліга нацый не магла-б захаваць сваё ўнутранае адзінства».

Па словах газеты «Эр нувель», Літвінаў прадэманстраваў, што артыкул 16 пакта Лігі з'яўляецца гарантыяй калектыўнай безапаснасці. Замах на гэты артыкул азначаў-бы забойства Лігі нацый.

Адзначыўшы ўказанне Літвінава на тое, што «няма такіх дзяржаў, або такога блоку дзяржаў, якія маглі-б супроцьстаяць аб'яднаным сілам членаў Лігі, нават у яе пяперашнім складзе», газета «Эр нувель» прадаўжае: «Тэзіс, падтрыманы дэлегатам Совецкага Саюза, з'яўляецца разумным тэзісам. Гэта тэзіс, які Францыя не перастане абараняць».

ЧЭХАСЛАВАКІЯ

ПРАГА, 2 лютага. (БЕЛТА). Рад чэхаславацкіх газет прысвячае спецыяльныя артыкулы выступленням народнага камісара замежных спраў СССР тав. Літвінава ў Жэневе, як прадстаўніка магутнай дзяржавы, няўхільна праводзячай палітыку міру.

Газета «Народні освобозені» спыняецца на выключнай эканамічнай і ваеннай магутнасці Совецкага Саюза, які з'яўляецца актыўным і паслядоўным барацьбітом за мір супроць фашысцкіх «пашалашчыкаў вайны. «Совецкі ўрад, — піша газета,— застаецца верным сваім старым нечахісным прынцыпам міру».

Далей газета піша: «Прапановы, якія ад імя СССР унёс у Жэневе народны камісар Літвінаў, накіраваны на ўмацаванне Лігі нацый, як зброі міру, на павышэнне яе аўтарытэта і яе дзейнасці...».

НА ФРАНТАХ У ІСПАНІІ

Паводле паведамлення рэспубліканскага міністэрства абароны, 2 лютага на розных участках франтоў адбывалася перастрэлка.

***

Генерал Міяха заявіў прадстаўнікам друку, што выбухам рэспубліканскіх мін у сектары Карабанчэля (на поўдзень ад Мадрыда) знішчана казарма мяцежнікаў. Пасля выбуху рэспубліканскія войскі заняілі рад дамоў недалёка ад ваеннага шпіталя. Новыя пазіцыі забяспечваюць панаванне пад Карабанчэлем — Бахо і Карабанчэлем Альто.

Мяцежнікі прадпрынялі рад ярасных атак, каб вярнуць страчаныя пазіцыі. Атакі гэтыя былі адбіты рэспубліканскімі войскамі.

ЗАЯВА ФРАНЦУЗСКАГА ПРЭМ'ЕРА ШАТАНА

ПАРЫЖ, 2 лютага. (БЕЛТА). Як паведамляе агенцтва Гавас, глава французскага ўрала Шатан у гутарцы з прадстаўнікамі друку заявіў, што бамбардыроўкі мірнага насельніцтва іспанскіх гарадоў набываюць пагражаючы характар і выклікаюць у кожным пачуцці абурэння. Французскі ўрад лічыць сваім абавязкам прыняць усе неабходныя меры, каб у найкароткі тэрмін дасягнуць згоды, якая пакладзе канец гэтым зверствам.

Шатан адзначыў далей, што ён пачаў перагаворы, каб забяспечыць гэтай ініцыятыве французскага ўрада падтрымманне з боку іншых дзяржаў.

ПАСЛЯ ПАТАПЛЕННЯ АНГЛІЙСКАГА СУДНА „ЭНДЫМІЁН"

ПАРЫЖ, 3 лютага. (БЕЛТА). Па паведамленнях з Лондана ўчора міністр замежных спраў Ідэн азнаёміў французскага пасла Корбена і італьянскага пасла Грандзі з мерамі, прымаемымі англійскім урадам для забеспячэння безапаснасці гандлёвага мораплавання ў Міжземным моры, і прасіў Італію і Францыю даць згоду на гэтыя меры. Англійскі ўрад прадугледжвае аднаўленне ў поўным аб'ёме аслабленай у апошні час аховы морскіх зон суднамі Англіі, Францыі і Італіі ў адпаведнасці з ніёнскімі пагадненнямі і настойвае на строгім захаванні правіл пагадненняў адносна плавання падводных лодак. Англійскі ўрад, па словах карэспандэнта газеты «Піці парызьен», з свайго боку «гатоў дзейнічаць з рашучасцю, каб аднавіць свабоду і безапаснасць плавання ў Міжземным моры».

ЛОНДАН, 3 лютага. (БЕЛТА). Па словах газеты «Дэйлі тэлеграф энд Морнінг пост», Ідэн уручыў паслам Францыі і Італіі мемарандум, у якім гаворыцца, што любая падводная лодка, заўважаная за межамі тэрытарыяльных вод, неадкладна падвергнецца нападу і патапленню без усякага папярэджання.

Ужо даны ўказанні, каб лік патрульных англійскіх суднаў быў дазведзен да ліку, прадугледжанага Ніёнскім пагадненнем.

Г. І. ПЕТРОЎСКАМУ ШЭСЦЬДЗЕСЯТ ГОД

(4 лютага 1878 г.—4 лютага 1938 г.)

Сёння спаўняецца 60 год Грыгорыю Іванавічу Петроўскаму — старэйшаму члену большэвіцкай партыі, выграбаванаму і адданаму рэволюцыянеру, беззаветна змагаючамуся пад кіраўніцтвам партыі Леніна — Сталіна за справу комунізма.

Г. І. Петроўскі — выхадзец з беднай сям'і. Дзед яго быў прыгонным, бацька—рамеснікам-шаўцом. З дзяцінства ён адчуў на сабе ўвесь цяжар і гнёт царскага рэжыму, матэрыяльныя нястачы, эксплаатацыю. Г. І. Петроўскі нарадзіўся ў 1878 годзе ў Харкаве. Трох год ён пазбавіўся бацькі. У сям'і запанавала цяжкая галеча. Маці Петроўскага, якая перабівалася сяк-так на падзённай рабоце, пральчкай, не магла даць адукацыю сыну. Толькі два з паловай годы правучыўся Грыгорый Іванавіч у школе і быў выключан з яе за няўплату грошай за вучобу.

Малады Петроўскі паступіў на работу ў майстэрні Курска-Харкаўска-Севастопальскай чыгункі, недалёка ад Харкава, дзе атрымліваў за работу 20 капеек у дзень. Але хутка ён быў зволен за скаргу на здзекі майстра.

Паўтара года Г. І. Петроўскі працуе падзённікам за жабрацкую плату, затым рашае пераехаць з Харкава ў Екацерынаслаў (Днепрапетроўск) да старшага брата. У Екацерынаславе з дапамогай брата ён устроіўся спачатку вучнем у тэлеграфныя майстэрні Екацерынінскай чыгункі, а затым на Бранскі завод (зараз завод імя Петроўскага) з заработкам у 35 капеек у дзень. Тут малады Петроўскі прайшоў усе этапы навучання: у кузні, у слясарнай, на падсобнай рабоце, пакуль не трапіў на работу да станка.

Ніжая заработная плата, доўгі, цяжкі рабочы дзень, сваволле і здзекі майстраў, зверская эксплаатацыя, праследванні царскай паліцыі выклікалі незадаволенне рабочых, нарастала абурэнне рабочых мас супроць эксплаататараў і зверскага рэжыму самадзяржаўя.

У 1897 годзе ў Екацерынаслаў ссылаецца група пецербургскіх рабочых-рэволюцыянераў. Г. І. Петроўскі зблізкаецца з імі. Яны дапамагаюць яму ўсвядоміць рэволюцыйныя задачы пролетарыята. Г. І. Петроўскі ўцягваецца ў рэволюцыйны рух, уступае ў рады РСДРП і ўключаецца ў кіпучую рэволюцыйную работу.

Летам 1898 года на Бранскім заводзе ўспыхнула забастоўка — «бунт», у якім Грыгорый Іванавіч прымае актыўны ўдзел.

Праз некаторы час Петроўскі едзе ў Нікалаеў. Там ён з іншымі рэволюцыянерамі вядзе зялікую работу па стварэнню нікалаеўскай арганізацыі РСДРП. Ён арганізуе рабочыя гурткі, вядзе вялікую рэволюцыйную работу.

За ўдзел у забастоўках летам 1900 года царскія ўлады высылаюць тар. Петроўскага з Нікалаева ў Екацерынаслаў. Тут ён звязваецца з мясповай с.-д. арганізацыяй і з галавой уваходзіць у рэволюцыйную работу. У сярэдзіне лета паліцыя арыштоўвае тав. Петроўскага. Год трымаюць яго ў турме ў адзіночнай камеры. У турме Петроўскі занят чытаннем маркісцкіх кніг і самаадукацыяй.

Пасля выхаду з турмы, каб пазбегнуць новага арышту, Г. І. Петроўскі пераязджае ў Данбас. Два з паловай годы ён працуе на шахтах разам з Майсеенка (кіраўніком марозаўскай стачкі), у 1903 годзе зноў арыштоўваецца і адбывае 6-месячнае турэмнае зняволенне.

Пасля вызвалення тав. Петроўскі паступіў на работу ў Екацерынаславе, дзе яго застала рэволюцыя 1905 года. Тав. Петроўскі — у цэнтры рэволюцыйных падзей. Ён — адзін з кіраўнікоў барыкадных баёў у Екацерынаславе, член стачачнага камітэта. Ён прымае ўдзел у стварэнні першага Совета Рабочых Дэпутатаў, выбіраецца спачатку цэхавым дэпутатам, а потым дэпутатам Екацерынаслаўскага Совета Рабочых Дэпутатаў.

Рэпрэсіі царскага ўрада пасля падаўлення рэволюцыі прымусілі тав. Петроўскага скрывацца. Ён уязджае на некаторы час за граніцу. Хутка ён зварачаецца ў Расію і пасяляецца ў Марыупалі, дзе прадаўжае весці рэволюцыйную работу ва ўмовах жорсткіх праследванняў царскай паліцыі.

Наступае новы ўздым рэволюцыйнага руху. У 1912 годзе Грыгорыя Іванавіча выбіраюць дэпутатам у IV дзяржаўную Думу ад рабочай курыі Екацерынаслаўскай губерніі. У 1914 годзе яго разам з іншымі дэпутатамі-большэвікамі арыштоўваюць. Г. І. Петроўскі быў саслан у Туруханск, дзе ён прабыў год, а затым быў выслан у Сярэдне-Калымск, Якуцкай вобласці. Па дарозе ў ссылку ў Якуцку яго і застала лютаўская рэволюцыя.

У лістападзе 1917 года Грыгорый Іванавіч у Петраградзе. Ён прызначаецца народным камісарам унутраных спраў РСФСР.

У 1919 годзе на Усеўкраінскім з'ездзе совецаў тав. Петроўскі выбіраецца старшынёй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта УССР. У 1922 годзе тав. Петроўскі выбіраецца таксама старшынёй Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта СССР.

На IX з'ездзе ВКП(б) Грыгорый Іванавіч выбіраецца кандыдатам у члены ЦК, на X з'ездзе ён выбіраецца членам ЦК.

Пасля XIV з'езда партыі тав. Петроўскі выбран кандыдатам у члены Палітбюро ЦК ВКП(б). Тав. Петроўскі — дэпутат і намеснік Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР.

Такі рэволюцыйны шлях Г. І. Петроўскага, вернага саратніка таварыша Сталіна. Грыгорый Іванавіч на працягу ўсёй сваёй рэволюцыйнай дзейнасці з'яўляецца адданым сынам партыі Леніна—Сталіна, ён вядзе непрымірымую барацьбу з усімі ворагамі партыі, ворагамі працоўных за таржаство комунізма.

КРАІНА СОВЕТАЎ РЫХТУЕЦЦА ДА ЮБІЛЕЯ РСЧА

МАСКВА, 3 лютага. (БЕЛТА). У гарадах і сёлах, на прадпрыемствах і ў калгасах неабсяжнай краіны Советаў разгарнулася падрыхтоўка да XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Вялікую работу праводзіць іжэўская арганізацыя Асоавіяхіма. Тут наладжваецца масавая інсцэніроўка двухбаковага бою. Удмурцкі аэраклуб к юбілею выпусціць новы атрад пілотаў, якія вучыліся без адрыву ад вытворчасці і цяпер здаюць дзяржаўныя экзамены. Лепшыя стралкі Іжэўска, сярод іх 5 жанчын, едуць у Тулу на стралковыя спаборніцтвы.

Конна-лыжны паход арганізуе клуб варашылаўскіх коннікаў Тамбоўскага гарадзкога совета Асоавіяхіма. У паходзе прымуць удзел 32 варашылаўскія коннікі. У дні святкавання XX-годдзя Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота клуб наладжвае вялікія конна-спартыўныя спаборніцтвы з рубкай, перамаганнем перашкод і т. д.

ЗА ВЫСОКІЯ ТЭМПЫ РАЗВІЦЦЯ ІЛЬНАТЭКСТЫЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Ільнапрацоўваючая прамысловасць БССР, якая апіраецца на магутную сыравінную базу, павінна ў 3-й пяцігодцы заняць адно з першых месц ва ўсёй прамысловасці рэспублікі.

Да гэтага часу развіццю ільняной прамысловасці не аддавалася належнай увагі. Між тым значэнне яе надзвычайна вялікае. З ільнавалакна робяць тканіны не толькі для задаволення індывідуальных патрэб насельніцтва, але і для тэхнічных патрэб раду важнейшых галін народнай гаспадаркі (аўтамабільнай, абутковай, хімічнай, мукамольнай і т. д.).

Апрача валакна, лён дае яшчэ каштоўнейшай якасці насенне, з якога атрымліваюцца не толькі харчовыя (масла) і кармовыя (жмыхі) прадукты, але і найлепшая па тэхнічных уласцівасцях аліфа. Нарэшце, адыходы первічнай апрацоўкі ільну даюць сыравіну для выпрацоўкі цэлюлозы і тэрма-ізаляцыйнага матэрыяла (з кастры), а таксама будаўнічы матэрыял-паклю.

БССР з'яўляецца адным з буйных ільнаводчых раёнаў СССР, і ў далейшым развіцці ільнаводства і ільняной прамысловасці павінна заняць у рэспубліцы значнае месца.

На XVII з'ездзе ВКП(б) таварышы Молатаў і Куйбышаў, вызначаючы задачы БССР у другой пяцігодцы, указалі на неабходнасць асаблівага развіцця ільняной прамысловасці.

У нас ёсць усе прадпасылкі для таго, каб моцна развіць ільняную прамысловасць на нашай мясцовай сыравіне.

Совецкая Беларусь мае багатыя рэсурсы ільнасыравіны. Дастаткова ўказаць, што 11,5 проц. пасеваў плошчаў ільнудаўгунца Саюза сканцэнтравана ў БССР.

Зусім процілеглую карціну ўяўляе сабой развіццё ў Беларусі ільнатэкстыльнай вытворчасці. Удзельная вага БССР да агульнага ліку верацён Саюза складае ўсяго толькі 5,7 проц. Ільнаткацкая вытворчасць у БССР зусім нікчэмная. Другім пяцігадовым планам прадугледжвалася рэканструкцыя ільнапрадзільнай фабрыкі імя Кагановіча ў Віцебску, таксама сканчэнне будаўніцтва і ўвод у эксплаатацыю новага ільнакамбіната ў Оршы. Але гэтыя мерапрыемствы не ажыццёўлены. Па пастанове II-й Сесіі ЦВК Саюза ССР VII склікання (1936 г.) камбінат павінен быў увайсці ў строй яшчэ ў 1936 годзе, але школнікі пастараліся сарваць выкананне гэтай пастановы і будаўніцтва камбіната і цяпер не скончана. Трэба прама сказаць, што ні Дзяржплан БССР, ні Наркамлегпром гэтай справай не цікавяцца і сёння.

У рэзультаце Беларусь, багатая ільном, выпускае толькі нязначную колькасць поўфабрыкатаў і зусім не выпускае ільняных тканін.

У трэцяй пяцігодцы побач з рэканструкцыяй існуючых прадпрыемстваў павінна быць разгорнута будаўніцтва новых ільнакамбінатаў.

Рашаючую ролю ў барацьбе за эфектыўнае ўжыванне ільну адыгрывае павышэнне ўраджайнасці і паляпшэнне якасці ільняной сыравіны, г. зн. павышэнне гатунковасці ільнасаломы. Такое патрабаванне ва ўсю шырыню павінна быць пакладзена ільнаводству і гатунковаму насенніцтву.

Пытанні якасці павінны дамініраваць і пры распрацоўцы праблемы развіцця первічнай апрацоўкі ільну, дзе асноўная ўвага павінна быць сканцэнтравана на павышэнні ўдзельнай вагі доўгага валакна і яго нумарнасці.

Мерапрыемствы па ўздыму якасці сыравіны, па лепшаму яе скарыстоўванню, па барацьбе са стратамі, павінны стаць прадметам шырокіх даследчых работ на ўсіх стадыях апрацоўкі ільну.

У сувязі з гэтым вельмі адказная задача стаіць таксама перад сектарам первічнай апрацоўкі ільну Навукова-даследчага інстытута прамысловасці БССР, у прыватнасці па механізацыі працэса мочкі ільну. Аслабанёвне ад ручной працы пры ільну. Аслабанёвне ад ручной працы пры расціле (або мочцы), звязаным з вялікімі ны эфект.

Не менш важныя задачы стаяць у галіне арганізацыі вытворчасці і рэканструкцыі тэхнікі апрацоўкі ільну.

У БССР павінны быць пабудаваны часальні, з тым, каб асноўную масу загатаўляемага ільнавалакна перапрацаваць у чосцы.

План развіцця ільнатэкстыльнай прамысловасці БССР у трэцяй пяцігодцы павінен прадугледзіць: пашырэнне ільнапрадзільнай фабрыкі імя Кагановіча і ператварэнне яе ў ільна-прадзільна-ткацка-аддзелачны камбінат; поўнае асваенне заканчваючагася будаўніцтвам Аршанскага ільнакамбіната; будаўніцтва новых ільнакамбінатаў на мясцовай сыравіне.

Рэканструкцыя фабрыкі імя Кагановіча дасць магчымасць выпускаць тканіны замест выпускаемай у сучасны момант пражы.

Ільнапрадзільная фабрыка імя Карла Маркса ў Высачанах прадстаўляе сабой старое прадпрыемства з вельмі зношаным абсталяваннем. У трэцяй пяцігодцы неабходна часткова абнавіць, а часткова адрамантаваць абсталяванне з тым, каб фабрыка змагла на крупільных машынах перапрацаваць пражу ў ніткі.

Магутнасць прадзільнай фабрыкі Аршанскага ільнакамбіната вызначаецца праектам у 16504 ачасковых верацён. Прадзільная вытворчасць камбіната перапрацоўвае ў год 12900 тон пражы. Ткацкая фабрыка камбіната абсталёўваецца 532 ткацкімі станкамі, яна будзе выпрацоўваць 27,4 млн. пагонных метраў тканіны.

Да канца трэцяй пяцігодкі БССР будзе мець вялікую колькасць ільнавалакна, якая можа быць скарыстана як для перапрацоўкі на ільнакамбінатах, так і для вывазу за межы рэспублікі.

Сыравінныя рэсурсы БССР да канца трэцяй пяцігодкі нават па мінімальных разліках даюць магчымасць запраектаваць будаўніцтва двух новых ільнакамбінатаў, выпрацоўваючых, галоўным чынам, тонкае ільняное палатно для шырспажыву і некаторую частку тканей для абутковай прамысловасці і інш. Да гэтага часу белыя ільняныя ткані высокай якасці вырабляюцца ў Саюзе ў зусім нязначнай колькасці, а попыт на іх вельмі вялікі.

Найбольш падыходзячым пунктам для будаўніцтва новых ільнакамбінатаў, з пункту гледжання набліжэння прамысловасці да крыніц сыравіны, трэба лічыць Віцебск і Магілеў.

Увод у эксплаатацыю і поўнае асваенне новых ільнакамбінатаў, а таксама рэканструкцыя фабрыкі імя Кагановіча забяспечыць вытворчасць у БССР 70700 пагонных метраў ільняных тканін у год. Для выпрацоўкі гэтай колькасці тканін патрабуецца штогод прыкладна 45000 тон ільнянога валакна. Акрамя гэтага неабходна ў план трэцяй пяцігодкі ўключыць будаўніцтва катанінай фабрыкі з перспектывай перапрацоўкі катаніна ў пражу і ткані.

Неабходна таксама прадугледзіць выкарыстоўванне адыходаў ільняных прадпрыемстваў і ў прыватнасці выкарыстоўванне кастры для вытворчасці цэлюлозы і тэрмаізаляцыйных матэрыялаў.

Ц. А. НЕМЦАЎ,
старшы навуковы работнік НДІ прамысловасці БССР.

Сакратар парткома віцебскай швейнай фабрыкі «Спяг індустрыялізацыі» тав. Каган гутарыць з агітатарамі фабрыкі. **НА ЗДЫМКУ** (злева направа): **І. Х. Лісіц, Н. С. Сабаленка, Г. Е. Краўчанка, Е. М. Цецера і Н. А. Каган.**

Фото С. Грына.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ
(ХРОНІКА)

НОВЫЯ КАДРЫ КІРУЮЧЫХ РАБОТНІКАЎ

СТАРЫЯ ДАРОГІ. У дні падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР вырасла дзесяткі комсамольскіх і беспартыйных актывістаў, якія зараз вылучаюцца на адказную кіруючую работу.

Загадчыкам райза вылучан комсамолец, старшыня выбарчай участковай камісіі тав. Моўсік. Загадчыкам Райана вылучан актыўны комсамолец, які працаваў у час выбараў сакратаром выбарчай камісіі, т. Генін. Актыўны комсамолец, які працаваў на выбарчым участку даверанай асобай, тав. Галайка вылучан загадчыкам райфа. Беспартыйны актывіст выбарчай кампаніі тав. Рабкоў вылучан загадчыкам райсабеза. Намеснікам загадчыка райза па жывёлагадоўлі вылучан беспартыйны актывіст т. Конюшко.

Актыўны комсамолец, агітатар на выбарчым участку т. Буракоўскі вылучан інспектарам райгандлю, агітатар т. Камісарчык вылучана загадчыкам ганлёвага аддзела райсаюза. Беспартыйны калгаснік т. Касько выбран старшынёй Крынькаўскага сельсовета. Агітатар выбарчай кампаніі комсамолец т. Зімін выбран старшынёй Дараганаўскага сельсовета, беспартыйны агітатар т. Зарубайка выбран старшынёй Кармазоўскага сельсовета.

Вылучаныя таварышы паказваюць узоры большэвіцкай работы па ліквідацыі вынікаў школніцтва і выканання своечасова і ў тэрмін рашэнняў партыі і ўрада.

Райком партыі прыняў рад практычных мер па выхаванню і штодзённай дапамозе вылучаным беспартыйным і комсамольскім актывістам. Партыйныя арганізацыі ўсямерна дапамагаюць вылучаным таварышам у выкананні іх складанай і адказнай работы.

Т. Н. ПРАСМЫЦКІ,
сакратар Старадарожскага райкома партыі.

У многіх раёнах актывісты-комсамольцы вылучаны на адказныя кіруючыя партыйныя і комсамольскія работы.

Комсамолка тав. Касцючэнка на працягу пяці год працавала старшай важатай. Зараз яна вылучана на пасаду сакратара райкома комсамола Багушэўскага раёна. Былы старшыня сельсовета — комсамолец тав. Кондрус зараз працуе сакратаром райкома комсамола Пухавіцкага раёна, маладая комсамолка тав. Пракопчык, нараджэння 1918 года, раней працаваўшая старшым піонерважатым, зараз працуе сакратаром райкома комсамола Лагойскага раёна.

Многа комсамольскіх работнікаў вылучана зараз на партыйную кіруючую работу. Былы сакратар Хоцімскага райкома комсамола тав. Шабета выбран другім сакратаром райкома партыі гэтага-ж раёна. Сакратар Лоеўскага райкома комсамола тав. Шчобетаў працуе зараз другім сакратаром райкома партыі гэтага-ж раёна, сакратар Грэскага райкома комсамола тав. Прыемка выбран другім сакратаром райкома партыі гэтага-ж раёна, і інш.

ЛЕПШЫЯ ЛЮДЗІ ЎСТУПАЮЦЬ У ПАРТЫЮ

МЕНСК. Партыйная арганізацыя станкабудаўнічага завода імя Кірава ў студзені месяцы 1938 года прыняла ў рады партыі актывістаў-комсамольцаў. Агульным сходам партыйнай арганізацыі прыняты ў кандыдаты партыі — комсамолец тав. Шохер (слесар новамеханічнага цэха), актывіст выбарчай кампаніі комсамолец тав. Лапідус (майстар кантрольнага аддзела завода). Пераведзены у члены партыі тав. Камінскі.

НА ПАРТЫЙНЫХ КАНФЕРЭНЦЫЯХ АРМЕЙСКІХ БОЛЬШЭВІКОЎ

Вечарам 3 лютага закончыла сваю работу 25 партыйная канферэнцыя 2-й стралковай дывізіі. З дакладам аб пастанове Пленума ЦК ВКП(б) «Аб памылках партарганізацый пры выключэнні комуністаў з партыі, аб фармальна-бюракратычных адносінах да апеляцый выключаных з ВКП(б) і аб мерах па ўстраненню гэтых недахопаў» выступіў начальнік Палітуправлення Беларускай ваеннай акругі тав. Сычоў.

Канферэнцыя заслухала справаздачу сакратара дывізійнай партыйнай камісіі тав. Раманава.

У спрэчках выступіла 38 чалавек. Выступаўшыя дэлегаты адзначалі выключнае значэнне рашэння Пленума, крытыкавалі недахопы ў рабоце партыйнай камісіі і партыйных арганізацый, намячалі мерапрыемствы па ліквідацыі гэтых недахопаў.

Работа канферэнцыі дэманстравала выключную згуртаванасць усёй партарганізацыі дывізіі вакол Сталінскага Цэнтральнага Камітэта, вакол любімага правадыра і настаўніка таварыша Сталіна.

Тайным галасаваннем выбрана дывізійная партыйная камісія ў колькасці 6 чалавек.

***

2 лютага адкрылася другая партыйная канферэнцыя Н-скага стралковага корпуса.

Даклад аб рашэннях студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) зрабіў тав. Крычанаў. Са справаздачным дакладам аб рабоце корпуснай партыйнай камісіі выступіў сакратар парткамісіі тав. Мікушын.

Па дакладах разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Выступіла 24 чалавекі. Дэлегаты ўскрываюць недахопы ў рабоце партыйных арганізацый і паліторгана корпуса. Дэлегат — малодшы камандзір тав. Мядзведчук расказаў аб фактах бяздушных адносін да члена партыі тав. Каслова. Дэлегат—лейтэнант тав. Сухаў гаворыць аб тым, што ў рабоце партыйных арганізацый корпуса былі дапушчаны сур'ёзныя памылкі, аб якіх указваецца ў рашэнні Пленума ЦК ВКП(б). Ён ілюструе гэта фактам няправільнага падыходу пры выключэнні з радоў партыі таз. Гнідзіна, які адноўлен корпуснай парткамісіяй.

Работа канферэнцыі, выступленні дэлегатаў з партарганізацый часцей корпуса сведчаць аб высокім ідэйным узроўні армейскіх большэвікоў.

4 лютага — працяг спрэчак па дакладах.

***

2 лютага лепшыя большэвікі Н-скай дывізіі сабраліся на сваю 23 дывізійную партканферэнцыю. Канферэнцыю адкрывае тав. Гогалеў. На першым пасяджэнні канферэнцыя заслухала даклад тав. Громава аб выніках работы студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б) і справаздачу тав. Мацвеюка аб рабоце дывізійнай партыйнай камісіі.

3 лютага на партканферэнцыі пачаліся спрэчкі па дакладах. Яны праходзяць пад знакам большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, накіраванай на хутчэйшае перамаганне памылак і недахопаў у рабоце партыйных арганізацый, на хутчэйшае ажыццяўленне рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б).

На канферэнцыі з прамовай выступіў дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Гарачоў. Ён заклікаў дэлегатаў канферэнцыі і ўсе партыйныя арганізацыі часцей дывізіі авалоддваць большэвізмам, вучыцца працаваць па-сталінску.

— Рыхтуючыся да XX гадавіны Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, — гаворыць у заключэнне тав. Гарачоў, — мы, армейскія большэвікі, павінны памятаць указанне таварыша Сталіна аб капіталістычным акружэнні, быць заўсёды гатовымі сакрушыць ворага, не пакладаючы рук працаваць для павышэння баявой і палітычнай падрыхтоўкі, для выканання загада наркома на 1938 год.

4 лютага канферэнцыя працягвае сваю работу.

ВЫПРАЎЛЯЮЦЬ ПАМЫЛКІ

ВІЦЕБСК. **(Кар. «Звязды»).** Комуніст первічнай партыйнай арганізацыі фабрыкі імя «КІМ» тав. Парэцкі, расшукваючы ў горадзе аднаго знаёмага чалавека, выпадкова зайшоў у адну кватэру, ў якой потым, як аказалася пражываў выкрыты зараз вораг народа. На аснове гэтых «матэрыялаў» партком фабрыкі абвінаваціў тав. Парэцкага ў сувязях з ворагам і выключыў яго з радоў партыі.

У 1933 годзе ў адным месцы быў наладжан банкет. У банкеце прымала ўдзел кандыдат партыі партыйнай арганізацыі швейнай фабрыкі «Спяг індустрыялізацыі» тав. Бароўшчанка. Сярод удзельнікаў банкета быў таксама былы сакратар гаркома комсамола, які потым аказаўся ворагам народа. Ніякай сувязі ў т. Бароўшчанка з ворагам народа не было, але самастрахоўшчыкі з партыйнай арганізацыі парашылі: раз прымала ўдзел у банкеце, дзе прысутнічаў вораг народа, значыць ты мела з ім песную сувязь і партыйная арганізацыя выключае тав. Бароўшчанка з радоў партыі.

Партыйны камітэт фабрыкі «Прагрэс» выключыў з радоў партыі члена сваёй арганізацыі тав. Ваўчка, якому прад'явілі абвінавачанне ў растраце 1000 рублёў у арцелі «Адраджэнне», дзе ён раней працаваў. Зараз высвятляецца, што т. Ваўчок ніякай растраты не рабіў. Да рэчы, выключэнню яго з партыі актыўна садзейнічаў інструктар райкома партыі тав. Масарскі, які параіў сакратару парткома фабрыкі «Прагрэс» тав. Дубкіну неадкладна пазбавіцца ад гэтага «сумніцельнага» чалавека.

Стаханавец тав. Угалёў папрацаваў у вагонным дэпо гэтай фабрыкі 40 год. Ён чэсны, адданы комуніст. У свой час у партком паступае заява на тав. Угалёва, што брат яго, які зараз працуе на адным з заводаў Украіны, у стары час быў прапаршчыкам. Матэрыял не правяраўся, але гэта паслужыла падставай для партыйнай арганізацыі, каб тав. Угалёва выключыць з партыі.

Такіх прыкладаў можна прывесці шмат. Яны ярка светчаць аб грубых памылках, дапушчаных партарганізацыямі пры выключэнні асобных комуністаў з радоў большэвіцкай партыі па віне кар'ерыстаў і самастрахоўшчыкаў. Пасля рашэння Пленума ЦК ВКП(б) рад партыйных арганізацый нават не лічыць сваім доўгам пасяшчыцца з адсылкай у гарком партыі пратаколаў, у якіх зафіксаваны матывы выключэння комуністаў з партыі. Чым, як не бяздушнымі, бюракратычнымі, саноўна-барскімі адносінамі да лёсу асобных комуністаў, можна растлумачыць той факт, што сакратар парткома вагоннага ўчастка тав. Арлоўскі пратакол аб выключэнні з радоў партыі чэснага комуніста т. Багдановіча прыслаў у гарком партыі толькі праз месяц і 11 дзён. Сакратар парткома воднікаў тав. Івашкін нават не сам аддаў пратаколы непасрэдна каму-небудзь з работнікаў гаркома, а проста палажыў іх пад дзверы пакоя аднаго інструктара гаркома.

У первічных партарганізацыях ідзе глыбокае вывучэнне гістарычных рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б). Рад партарганізацый па-большэвіцку выпраўляе раней дапушчаныя памылкі.

Таварышы Парэцкі, Бароўшчанка і рад іншых адноўлены ў партыі. Гарком партыі на сваім пасяджэнні 23 студзеня таксама аднавіў у партыі некалькі комуністаў, няправільна выключаных первічнымі партарганізацыямі (тав. Данімана — фабрыка «Спяг індустрыялізацыі» і інш.). Асобныя партыйныя справы гарком перадаў на перагляд первічным партарганізацыям.

Некаторыя кіраўнікі первічных партарганізацый (накшталт сакратара парткома фабрыкі «Прагрэс» тав. Дубкіна) нават і пасля рашэння Пленума ЦК ВКП(б) усё яшчэ працягваюць самастрахавацца, не лічаць сваім партыйным абавязкам неадкладна выпраўляць дапушчаныя памылкі партыйнымі арганізацыямі пры выключэнні асобных комуністаў з радоў партыі.

Факты аб няправільным выключэнні з партыі тав. Ваўчка прызнае і сам сакратар парткома тав. Дубкін, але пытанне аб партыйнасці ўсё-ж не пераглядае. Партком вагоннага ўчастка (сакратар тав. Арлоўскі) хаця і аднавіў т. Угалёва ў партыі, але, чамусьці, палічыў патрэбным застрахавацца на ўсякі выпадак: вынесці яму вымову. Да гэтага часу ні адзін з паклёпнікаў, самастрахоўшчыкаў, кар'ерыстаў не прыцягнуты да строгай партыйнай адказнасці за кампраметацыю чэсных комуністаў, стаўшых афіярай копіемятацеляў.

Траба з усёй рашучасцю адзначыць абураючае запягванне з вырашэннем пытання выключаных комуністаў з радоў партыі ў Парткалегіі пры ўпаўнаважаным КПК па БССР. Адных толькі віцебскіх партыйных спраў ў КПК 147.

С. БРАЙНІН.

БЯЗЛІТАСНА ВЫКРЫВАЦЬ КАР'ЕРЫСТАЎ І ПЕРАСТРАХОЎШЧЫКАЎ

Поўным адабрэннем спаткала ўся наша партыя пастанову студзеньскага Пленума ЦК ВКП(б). У прасякнутай палітычнай мудрасцю пастанове Пленума Цэнтральнага Камітэта партыі і краіна зноў прачыталі вялікія сталінскія клопаты аб чалавеку, члену партыі, работніку.

Велізарная гістарычная работа прароблена нашай партыяй па ачышчэнню сваіх радоў ад замаскаваных трацкісцка-бухарынскіх фашысцкіх бандытаў, ад гнілых элементаў, ад чуждых партыі людзей. Гэта ачышчальная работа паказала свету жалезнае адзінства партыі, яе згуртаванасць вакол Сталінскага Цэнтральнага Камітэта, яе баявую гатоўнасць, яе глыбокую і кроўную сувязь з народам.

Сталінскі Цэнтральны Камітэт перасцерагае ўсю партыю ад настрояў самазадавальнасці. Студзеньскі Пленум ЦК ВКП(б) з усёй сілай пацвярджае патрабаванне няўхільнай большэвіцкай пільнасці. Не ўсе ворагі партыі ўскрыты і выкрыты. Ворагі народа — агенты фашызма, шпіёнска-дыверсанцкая сволач, — прыбягаюць да новых форм маскіроўкі. Усякая праява ідыёцкай хваробы — бесклапотнасці—адкрывае шчыліну для хітрага і подлага ворага.

Партыя Леніна—Сталіна патрабуе ад большэвікоў сапраўднай, а не паказной пільнасці і перасцерагае партыйныя арганізацыі, якія часам ідуць на павазу ў крыкуноў-кар'ерыстаў. Пленум ЦК ВКП(б) указаў у сваёй пастанове, што факт валавога, бяздушна-механічнага, аўтаматычнага падыходу да пытання аб выключэнні і да пытання аб разглядзе скаргаў выключаных меў месца «перш за ўсё таму, што сярод комуністаў існуюць, яшчэ не ўскрыты і не выкрыты **асобныя кар'ерысты-комуністы, якія стараюцца вызначыцца і вылучыцца на выключэннях з партыі, на рэпрэсіях супроць членаў партыі, якія стараюцца застрахаваць сябе ад магчымых абвінавачанняў у недахопе пільнасці шляхам прымянення агульных рэпрэсій супроць членаў партыі».**

Клапоцячыся больш усяго на свеце аб сваім асабістым становішчы, аб асабістых выгодах, аб спакоі, кар'ерыст баіцца, пазбягае ўсякай адказнасці. Ва ўсіх выпадках жыцця ён імкнецца перастрахавацца. Адсюль — подлая дзейнасць такога, з дазволу сказаць, комуніста, стараючагася выслужыцца на выключэннях, стараючагася перастрахавацца пры дапамозе рэпрэсій супроць членаў партыі. Паклёпніцкая дзейнасць кар'ерыста праследуе адну мэту: выслужыцца самому, застрахаваць сябе ад магчымых абвінавачанняў у недахопе пільнасці, прыпісаць сабе мнімыя заслугі ў выкрыцці ворагаў.

Наша партыя заўсёды вяла жорсткую і бязлітасную барацьбу з прэзрэннымі шкурнікамі-кар'ерыстамі, якія прымазваліся да перамогшай партыі большэвікоў. Ленін патрабаваў бязлітаснай расправы з кар'ерыстамі, часам зрываўшымі палітыку партыі, вызначаўшыміся грубымі, цынічнымі, хамскімі адносінамі да мас.

Кар'ерызму, паклёпу, бяздушна-бюракратычным адносінам да чалавека — гэтым перажыткам капіталізма павінна быць аб'яўлена бязлітасная вайна. Пара выкрыць кар'ерыстаў-комуністаў, сарваць з іх маску фальшывай пільнасці, вывесці іх на чыстую ваду. Кар'ерыст баіцца за сваё становішча ў партыі, злабытае ашуканствам. Таму ён развозіць плёнку, шуміху, мітусню. Таму ён з лёгкасцю патрабуе выключэння з партыі на якой-небудзь фармальнай падставе або зусім без падставы. Для яго не існуе іншых мер спагнанняў у адносінах правіліўшыхся членаў партыі, апрача аднаго — выключэння. Кар'ерыст-комуніст абавязкова апалчыцца супроць тых таварышаў, хто пасмее прапанаваць меншую меру пакарання, і, нічтожа сумняючася, прылепіць ім ярлык пасобнікаў ворагаў.

Тым самым кар'ерысты затрудняюць партыі ачышчальную работу ад ворагаў народа, ад прытаіўшыхся трацкісцка-бухарынскіх бандытаў, **якія таксама скарыстоўваюць паклёп і правакацыю супроць чэсных членаў партыі.** Замест таго, каб ускрыць усе махінацыі кар'ерыстаў, граючых на руку ворагам, іншыя кіраўнікі партыйных арганізацый самі нярэдка ствараюць ім арэол пільных барацьбітоў за чыстату радоў партыі. Паказальна ў гэтых адносінах бясслаўная дзейнасць Утропава з хабараўскай партыйнай арганізацыі, які ўсяляк чарніў чэсных членаў партыі, ствараючы сабе славу «пільнага». Сарваць з кар'ерыстаў маскі, навучыць на канкрэтных прыкладах сапраўднай пільнасці — такава первейшая задача кожнай арганізацыі.

Ліберальныя адносіны да кар'ерыстаў-комуністаў выказалі некаторыя кіраўнікі Орджанікідзеўскай арганізацыі. Там добра ведаюць аб справе комуніста Пятрова, члена партыі з 1905 года, супроць якога паклёпнікі з пальца высмактралі абвінавачанні ў саўдзельніцтве з ворагамі народа. Паклёпнічаў на тав. Пятрова разлажыўшыйся тып, нейкі Савінаў. Цяпер тав. Пятрова рэабілітавалі, але далей гэтага не пайшлі. Подлага паклёпніка, гатаўзаўшага брудныя заявы на чэсных людзей, крайком не крануў.

У Саратаўскай арганізацыі добра вядома многім членам партыі і кіраўнікам фізіяномія кар'ерысткі Гаранінай, якая зрабіла сваёй прафесіяй паклёп на членаў партыі. У абласных партыйных органах скапілася каля 40 заяў Гаранінай. Яна карыстаецца чуткамі і плёткамі. Свае заявы яна пачынае такімі фразамі: «Мне перадавалі», «я чула», «калі гэты факт правільны, то...» і т. п. Гаранёва была пераведзена з членаў партыі ў кандыдаты за прыступленне рэвалюцыйнай пільнасці і цяпер усяляк страхуецца. Дзіўна, што Саратаўскі абком партыі да гэтага часу не раскусіў гэту кар'ерыстку, не выкрыў яе антыпартыйную дзейнасць.

Салтыкоў-Шчэдрын пісаў: «Распаўсюджваецца паклёп тайна, так што канцоў яго амаль нематчыма знайсці. Тым не менш становішча паклёпніка павінна быць жудасна. Кожную мінуту ён пазінен апасацца, што яго выкрыюць». Траба вывесці на чыстую ваду ўсіх паклёпнікаў, кар'ерыстаў-комуністаў, нельга пакідаць беспакаранымі іх брудныя ўчынкі. Справа гонару партыйных кіраўнікоў стварыць у арганізацыях атмасферу сапраўднай большэвіцкай пільнасці, каб нікому не было павадна паклёпнічаць на чэсных членаў партыі.

Абавязак кожнага большэвіка — выкрываць варожых партыі людзей, ворагаў народа. Член партыі павінен быць заўсёды на варце, своечасова сігналізаваць аб праісках ворага, як-бы хітрым і зваротлівым ні быў вораг. Партыйныя арганізацыі абавязаны глыбока ўдумвацца ў сутнасць абвінавачанняў, прад'яўляемых члену партыі.

Пастанова Пленума ЦК ВКП(б) выкрывае прыёмы подлай работы кар'ерыстаў-комуністаў, ускрывае характэрныя для іх адзнакі. **Ні агульнага апарочвання членаў партыі, ні агульнага ўседаравання выключэньных партыя не дапусціць. Партыя патрабуе ад усіх арганізацый індывідуальнага падыходу пры рашэнні пытанняў аб выключэнні з партыі, патрабуе старанной праверкі ўсіх матэрыялаў, найстражэйшай пільнасці і максімума асцярожнасці, таварыскіх клопатаў пры рашэнні пытання аб лёсе члена партыі. Партыя не пацерпіць і выкрые, заклеймёіць кар'ерыстаў, людзей, якія стараюцца выслужыцца на выключэннях з партыі, стараюцца перастрахавацца пры дапамозе рэпрэсій супроць чэсных большэвікоў.**

(«ПРАВДА»).

ПАЛАЖЭННЕ АБ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПЛАНАВАЙ КАМІСІІ

СНК Саюза ССР зацвердзіў палажэнне аб Дзяржаўнай Планавай камісіі пры Совеце Народных Камісараў Саюза ССР (Дзяржплан СССР). Дзяржаўная Планавая камісія СССР складаецца з 11 членаў, персанальна зацвярджаемых Советам Народных Камісараў Саюза ССР з ліку кіруючых планавых работнікаў, віднейшых навуковых работнікаў і спецыялістаў.

Дзяржаўная Планавая камісія распрацоўвае і прадстаўляе на разгляд Совета Народных Камісараў Саюза ССР народнагаспадарчыя перспектыўныя, галавыя і квартальныя планы, заключэнні па перспектыўных, галавых і квартальных планах, складзеных наркаматамі, веламствамі Саюза ССР і саюзнымі рэспублікамі; правярае выкананне ўстаноўленых народнагаспадарчых планаў Саюза ССР; распрацоўвае па заданнях СНК Саюза ССР і па сваёй ініцыятыве асобныя праблемы соцыялістычнай гаспадаркі і т. д.

Галоўнай задачай Дзяржплана з'яўляецца забеспячэнне ў плане народнай гаспадаркі СССР правільных суадносін у развіцці розных галін і неабходных мерапрыемстваў па недапушчэнню дыспрапорцый у народнай гаспадарцы.

На Дзяржаўную Планавую камісію ўскладаецца задача ўвязкі ў плане народнай гаспадаркі Саюза ССР работы сумежных галін соцыялістычнай вытворчасці, злабыўчай і апрацоўчай прамысловасці, сельскай гаспадаркі і індустрыі, транспарту і народнай гаспадаркі, увязкі росту вытворчасці і росту спажывання, ажыццяўлення правільнага раённага размяшчэння прадпрыемстваў, у мэтах ліквідацыі дальніх і сустрэчных перавозак, набліжэння прадпрыемстваў да крыніц сыравіны і да раёнаў спажывання іх прадукцыі.

Для ажыццяўлення гэтых задач Дзяржаўная Планавая камісія мае: свой цэнтральны апарат у выглядзе аддзелаў, сектароў і груп, а ў рэспубліках, краях і абласцях — упаўнаважаных Дзяржаўнай Планавай камісіі па праверцы выканання народнагаспадарчых планаў.

Упаўнаважаныя непасрэдна падпарадкаваны Дзяржплану СССР і працуюць незалежна ад рэспубліканскіх, краявых і абласных планавых камісій.

Пры Дзяржаўнай Планавай камісіі знаходзіцца Цэнтральнае кіраўніцтва народнагаспадарчага ўчоту, якое працуе па асобнаму палажэнню, зацвярджаемаму Советам Народных Камісараў Саюза ССР.

Упаўнаважаныя Дзяржаўнай Планавай камісіі ў рэспубліках, краях і абласцях назначаюцца і адклікаюцца Советам Народных Камісараў Саюза ССР па прадстаўленню Старшыні Дзяржаўнай Планавай камісіі пры СНК СССР і працуюць па яго заданнях.

Пры Дзяржплане існуе Совет у складзе членаў, упаўнаважаных Дзяржплана і іншых планавых работнікаў — усяго да 90 чалавек.

ПА-БОЛЬШЭВІЦКУ РЫХТАВАЦЦА ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ, ПАДМАЦАВАНЫЯ СПРАВАМІ

У калгасным клубе на многалюдным сходзе выступіў з прамовай старшыня калгаса Уладзімір Дзмітравіч Тоўсты. Дакладчык гаварыў проста і дзелавіта, гаварыў, як лепш выканаць пастанову партыі і ўрада, аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

— Праўленне калгаса разам з брыгадзірамі, разам з калгасным актывам усё вылічылі, усё ўзважылі і рашылі, што ў гэтым годзе ў сярэднім 16 — 17 цэнтнераў зернавых і 250 цэнтнераў бульбы з гектара па калгасу даб'емся ва што-б та ні стала. Такі ўраджай ужо ў мінулым годзе мелі многія калгасы нашага раёна. А нам што, хіба на раду запісана адставаць?..

Пастаноўка гэтага пытання выклікала жывую зацікаўленасць. З гарачымі прамовамі аб тым, як змагацца за ўраджай, выступілі ўдзельнікі схода калгаснікі Пятрусь Лапіцкі, Васіль Тоўсты, Анюта Тоўстая і многа іншых.

У адказ на заклік перадавікоў арганізаваць сацыялістычнае спаборніцтва за высокі ўраджай, у калгасе было створана 18 стаханаўскіх звенняў, у якія ўвайшло 94 чалавекі.

Звеннявыя абавязаліся дабіцца з асобных участкаў не менш 20 цнт. зернавых з гектара, 10 цнт. ільнавалакна, 350 цнт. бульбы і 800 цнт. буракоў. Паміж брыгадамі і звеннямі былі заключаны дагаворы на сацыялістычнае спаборніцтва. У цэлым па калгасу ў парадку соцспаборніцтва сход калгаснікаў абавязаўся: добрай падрыхтоўкай да веснавой сяўбы забяспечыць ураджайнасць у сярэднім па калгасу: аўсу 16 цнт., ячменю і пшаніцы па 17 цнт., ільнавалакна 6 цнт., бульбы 250 цнт., буракоў 500 цнт. з гектара.

За абавязацельствамі калгаснікаў паследавалі канкрэтныя справы. Зараз у калгасе поўнасцю засышана насенне, якое добра ачышчана і адпавядае пасеўным кандыцыям. Увесь сельскагаспадарчы інвентар і калёсы адрамантаваны і ў поўным парадку стаяць па брыгадах пад навесамі. Зброя таксама адрамантавана і змазана, у дастатковай колькасці загатоўлена новых пастронкаў і лейцаў. Поўнасцю вывезена мінеральнае ўгнаенне. Зараз узмоцненымі тэмпамі праводзіцца вывазка на поле гною і торфу. Ужо вывезена 739 тон торфу і 2114 вазоў гною. На гэтай рабоце пераважна працуюць жанчыны (мужчыны заняты на лесавывазцы). Калгасніцы Жэня Шэмет, Анюта Тоўстая, Марфа Пяткевіч, Аксіння Ліпай і многія іншыя па вывазцы гною і торфу і на іншых сельскагаспадарчых работах выконваюць нормы выпрацоўкі на 150—170 проц. У калгасе зараз налічваецца 79 стаханаўцаў.

У калгасе арганізаваны гурткі па вывучэнню агратэхнікі, якімі кіруе аграном Гляцэвіч. Заняткі адбываюцца чатыры разы ў месяц. Гурткі наведваюць 65—70 чалавек.

Настаўнікі Зенькавіцкай НСШ актыўна дапамагаюць кіраўніцтву калгаса ў мабілізацыі мас на ўзорную падрыхтоўку да сяўбы. Ва ўсіх пяці брыгадах калгаса працуюць політгурткі, якімі кіруюць настаўнікі: тт. Алесь Прыёмка, Ігнат Козел, Іосіф Ус. Ліда Стасевіч і Анна Кароль. У гуртках калгаснікі вывучаюць сваю цудоўную радзіму, знаёмяцца з міжнародным станоўішчам. Настаўнікамі мабілізаваны вучні для збору попелу. Пры актыўнай дапамозе вучняў у калгасе ўжо сабрана 45 цнт. попелу.

5 лютага тут чакаюць прадстаўнікоў з калгаса імя Пакроўскага, Асерскага сельсовета, якія прыедуць праверыць выкананне дагавора па сацыялістычнаму спаборніцтву па падрыхтоўцы да сяўбы. Брыгадзіры ўважліва правяраюць гатоўнасць сваіх брыгад, выпраўляюць недахопы.

— А за доглядам коней вас не пахваляць, коней чысціць трэба, — заўважыў старшыні калгаса, зайшоўшы на канюшню дырэктар школы.

— Гэта правільна, — прызнацельна заўважае той, — спаборніцтва за лепшы догляд коней яшчэ па-сапраўднаму не арганізавана паміж конюхамі. Кармамі коні забяспечаны ўдосталь. У кожнай брыгадзе створаны браніраваныя фонды кармоў на час сяўбы. Слабейшых коней паставілі на ашчынак. А зараз трэба ўвесці, як абавязковае правіла, чыстку коней.

Калгаснікі буйнейшага калгаса Ўзлянскага раёна «Іскра калектывізацыі» змагаюцца за новыя перамогі сацыялістычнага земляробства ў першым годзе трэцяй сталінскай пяцігодкі.

Я. ІВАШЫН.

У Клімавіцкую МТС для дапамогі ў рамонце трактараў і прыцапнога інвентару прыбыла з магілеўскіх фабрык і заводаў брыгада інжынераў і тэхнікаў. **НА ЗДЫМКУ:** кіраўнік брыгады інжынер т. **Папкін** за праверкай каленчатага вала трактара.

Фото Розельмана (БСФ).

ВЫЯВІЦЬ ЛЕПШЫЯ МЯСЦОВЫЯ ГАТУНКІ

У 22 калгасах нашай рэспублікі, згодна пастановы СНК СССР — «Аб мерах па палепшанню насення збожжавых культур» створаны гатункавыпрабавальныя ўчасткі. Участкі ўкамплектаваны зараз кадрамі. Ёсць загатункі (апрача віцебскага ўчастка), першыя памочнікі і праводзіцца падбор другіх памочнікаў. На кожным участку ўстаноўлены самастойныя севазвароты, якія зацвярджаны взяжаўнай камісіяй. У часе азімай сяўбы на 15 участках закладзены ў гатункавыпрабаванне 25 гатункаў пшаніцы і 12 гатункаў жыта.

У гэту вясну на кожным участку будзе пасеяна ў конкурсным гатункавыпрабаванні да 170 гатункаў такіх культур, як яравая пшаніца, ячмень, авёс, грэчка, проса, віка, гарох, фасоль, канюшына і люпаіна. Апрача таго будзе праводзіцца і вытворчае гатункавыпрабаванне на значна большых дзялянках. Адначасова з выпрабаваннем селекцыйных гатункаў значная частка будзе высявацца і з лепшых мясцовых неселекцыйных гатункаў.

З мясцовых гатункаў па яравой пшаніцы намечана пусціць у гатункавыпрабаванне такія, як «Ледоўка», «Брагінская», «Хойніцкая» і «Веткаўская». Апрача таго пускаецца ў гатункавыпрабаванне 15 мясцовых гатункаў грэчкі з розных калгасаў рэспублікі, 6 гатункаў проса і 5 гатункаў канюшыны.

Работа па выяўленню лепшых мясцовых гатункаў праводзіцца і зараз. Аршанскім участкам выяўлена ў калгасе «Чырвоныя Ліпкі», Шклоўскага раёна, пшаніца пад назвай «Белакорка», якая дае ўраджайнасць з гектара 25—30 цэнтнераў. У калгасе «1 мая», Аршанскага раёна, выяўлена мясцовая грэчка, сярэдняя ўраджайнасць якой у мінулым годзе была 10 цэнтнераў з гектара.

На ўсіх гатункавыпрабавальных участках брыгады калгасаў, якія прымацаваны да іх, па-ўдарнаму рыхтуюцца да веснавой сяўбы. Усюды закончан рамонт сельскагаспадарчага інвентару. Зараз праходзіць загатоўка і вывазка ўгнаенняў. Так, на дрысенскім участку, які знаходзіцца ў калгасе імя Калініна, загатоўлена для палёў 850 тон торфу, з якіх на поле вывезена ўжо 252 тоны і больш 100 тон гною.

Трэба адзначыць, што школнікі, арудаваўшыя ў зямельных органах рэспублікі, усімі мерамі імкнуліся не даваць ходу перспектыўным добраўраджайным мясцовым гатункам, яны часта іх спісвалі і выводзілі ў тыраж. Аднак да гэтага часу раён і МТС не праводзяць ніякай работы па выяўленню лепшых мясцовых гатункаў; гэтым самым яны не дапамагаюць гатункавыпрабавальным участкам у выкананні вельмі адказнай дзяржаўнай справы.

Н. В.

НЕЦЯРПІМЫЯ АДНОСІНЫ ДА НОВАЙ МТС

Нованарганізаваная ў канцы 1937 года Арловіцкая машынна-трактарная станцыя павінна адрамантаваць 16 трактараў. З іх 11 машын патрабуюць капітальнага і 5 сярэдняга рамонту.

Да гэтага часу МТС адрамантавала толькі 8 мастоў для трактараў і адзін трактар выпусціла з рамонту. Рамонт трактараў ва ўстаноўлены тэрмін зрываецца па віне Аршанскай машынна-трактарнай майстэрні.

Па дагавору з нашай МТС Аршанская МТМ павінна была адрамантаваць 3 маторы ў чацвертым квартале мінулага года і 8 матораў у першым квартале. Мы здалі ў МТМ 9 матораў, а таксама бабіт і волава для іх. Але да апошняга часу МТМ не прыступіла рамантаваць трактары.

Зрываецца таксама забеспячэнне МТС гаручым. З-за адсутнасці тары да вясны гаручае не загатаўляецца. Было пастаўлена нытанне перад Наркамземам БССР аб тым, каб для МТС адпусцілі 2 цыстэрны, якія знаходзяцца на станцыі Красное і нікім не скарыстоўваюцца ўжо на працягу паўтара года. Але ніякіх вынікаў не атрымалі.

Такія адносіны да новай МТС з боку Аршанскай МТМ і Наркамземаў далей нецярпімы.

І. П. РАЙХМАН,
дырэктар Арловіцкай МТС, Дуброўенскага раёна.

ВЫВАЗКА УГНАЕННЯ НЕ АРГАНІЗАВАНА

Па намечанаму плану агратэхнічных мерапрыемстваў на 1938 год калгасы Асіпавіцкага раёна павінны вывезці пад яравыя 38 тысяч тон торфу і 100 тысяч тон гною. На 1 лютага план вывазкі торфу выканан на 23 проц. і гною — на 24 проц. Гэтыя лічбы паказваюць, што вывазка ўгнаенняў прадастаўлена самацёку.

Асабліва ганебна адстаюць па зімовай вывазцы торфу і гною калгасы Касянскага, Пагарэльскага, Зборскага, Яноўскага і Ліпеньскага сельсоветаў. Гэтыя сельсоветы выканалі свае заданні ад 8 да 15 проц.

Так, па Касянскаму сельсовету з 8 калгасаў толькі 1 калгас імя Варашылава пачаў вывазку торфу. З 72[illegible] тон торфу, намечаных па плану, калгас імя Сталіна не вывез ні аднаго воза. Праўленне калгаса імя Кірава (той-жа сельсавет) на чале з старшынёй тав. Фрунцкім матывуюць зрыў вывазкі торфу і гною недахопам цягавай сілы. На самай-жа справе — гэта толькі адгаворкі. Апрача коней у калгасе ёсць 5 штук рабочых валоў. Яны стаяць і на гаспадарчай рабоце не выкарыстоўваюцца.

Усе калгасы раёна маюць поўную магчымасць удосталь забяспечыць глебу ўгнаеннямі. Гэту работу трэба толькі арганізаваць.

ДАЙНЯК.

ТЭЛЕФАНІЗАЦЫЯ СЕЛЬСОВЕТАЎ ДА ВЕСНАВОЙ СЯЎБЫ

Будаўнічая кантора Беларускага кіраўніцтва сувязі пачала работу па тэлефанізацыі сельсоветаў рэспублікі да веснавой сяўбы. Да 1 мая намечана тэлефанізацыя 26 сельскіх советаў у раёнах — Чачэрскім, Рэчыцкім, Уваравіцкім, Нараўлянскім і інш. У некаторых раёнах ужо ідзе падвеска правадоў.

Апрача таго, у 10 сельсоветах паляпшаецца тэлефонная сувязь шляхам падвескі новых правадоў.

На тэлефанізацыю сельсоветаў да веснавой сяўбы выдаткоўваецца звыш 100 тыс. рублёў.

У МСЦІСЛАЎСКІМ РАЁНЕ ЗРЫВАЕЦЦА ЛЕСАВЫВАЗКА

Горацкі леспрамгас, які ядае тры раёны — Горацкі, Дрыбінскі і Мсціслаўскі, — на 1 лютага выканаў квартальны план лесазагатовак на 34,5 проц., вывазкі — 24,8 проц.

Асабліва адстае Мсціслаўскі раён, удзельная вага якога складае 45 проц. плана леспрамгаса. Усяго тут вывезена 3.706 кбм. драўніны—13,2 проц. плана.

Ганебнае адставанне Мсціслаўскага раёна тлумачыцца перш за ўсё тым, што райвыканком (старшыня тав. Казлоў) і райком КП(б)Б (сакратар тав. Маркаў) займаюцца лесазагатоўкамі... у сваіх кабінетах. Часамі, праўда, яны выклікаюць да сябе некаторых старшынь сельсоветаў і калгасаў, як гаворыцца «для накачкі». За ўвесь час ні адзін адказны работнік раёна не выязджаў у калгасы па арганізацыі калгаснікаў на вывез у лес, для растлумачэння ўсёй дзяржаўнай важнасці выканання плана лесазагатовак.

Факты гаворыць аб тым, што там зве кіраўнікі раёна выязджаюць на месцы, дапамагаюць старшыням калгасаў арганізаваць масы на лесавывазку, там справа адразу наладжваецца.

Калгас імя Будзённага, Капелеўскага сельсовета, Горацкага раёна, калгас «Авангард», Пакупянскага сельсовета Дрыбінскага раёна, калгас імя Кірава, Курманаўскага сельсовета, Мсціслаўскага раёна, пасля правядзення адпаведнай работы адразу-ж сталі штодзённа высылаць у лес па 25—30 падвод.

Некаторыя калгасы Руткоўскага і Шырынскага сельсоветаў, Горацкага раёна, як «Перамога» (старшыня Сасноўскі), «Верны шлях» (старшыня Аліменко), «Рассвет» (старшыня Тускоў) да 1 лютага поўнасцю закончылі план асенне-зімовай лесавывазкі. Але такіх калгасаў пакуль яшчэ адзінкі.

Разам з тым у гэтых раёнах ёсць многа старшынь калгасаў, якія па сваёй асабістай віне адмаўляюць работу ў лесе, — моў, часу яшчэ наперадзе многа.

Старшыня Печанкоўскага сельсовета, Мсціслаўскага раёна, Лазараў і парторг Успілоўскі проста сабатуюць лесазагатоўкі. Пяць калгасаў гэтага сельсовета вывезлі ўсяго на 1 лютага 222 кубаметры, замест 2.500. Гэта ў той час, калі калгасы знаходзяцца літаральна ў лесе.

Парторг тав. Успілоўскі з'яўляецца старшынёй калгаса «Прамень Кастрычніка», гэтага-ж сельсовета. Яго калгас вывез усяго 42 кубаметры—5 проц. плана.

Не гледзячы на патрабаванне бюро Мсціслаўскага райкома КП(б)Б, Лазараў і Успілоўскі працяваюць сабатаваць лесазагатоўкі.

Па пастанове ЦК ВКП(б) з 5 лютага ў БССР пачынаецца стаханаўскі месячнік па лесазагатоўках і вывазцы. Гэты месячнік пакажа, наколькі здольны кожны кіраўнік леспрамгаса ўзначаліць барацьбу за чоткую пастаноўку работы ў лесе і арганізацыі масава-палітычнай работы сярод калгаснікаў, аднаасобнікаў. Гэты месячнік пакажа, наколькі яны сур'ёзна ўзяліся за ліквідацыю вынікаў шкодніцтва ў лясной прамысловасці. Дапамога ў гэтым павінна быць аказана з боку раённых арганізацый.

І. БЕЛЕНЬКІ.

ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЕМ ПЛАН ЛЕСАЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ

З ПІСЬМА ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ АСІПАВІЦКАГА РАЁНА ДА ЎСІХ КАЛГАСНІКАЎ БЕЛАРУСІ

Дарагія таварышы!

Лес мае вялікае значэнне для развіцця народнай гаспадаркі краіны. Лес ідзе на справу абароны нашай краіны, на прамысловае будаўніцтва, на запал.

План лесазагатовак і вывазкі па нашаму раёну выконваецца нездавальняюча. Асобныя кіраўнікі сельсоветаў і калгасаў не разумеюць таго, што ад своечасовага выканання плана лесазагатовак і вывазкі залежыць своечасовае і добраякаснае правядзенне першай вясны трэцяй сталінскай пяцігодкі.

Мы, калгаснікі калгаса «Першае мая», Лапіцкага сельсовета, на 27 студзеня 1938 года квартальны план лесавывазкі выканалі на 40 працантаў. Зараз мы бяром на сябе наступныя абавязацельствы: план першага квартала 1938 года па лесазагатоўках і вывазцы поўнасцю выканаць да 20 лютага. Мы штодзённа будзем вывозіць 32 кубаметры і загатаўляць 45 кубаметраў лесаматэрыялу. Наша цягавая сіла будзе добра падрыхтавана да вясны. Выклікаем на спаборніцтва калгаснікаў калгаса «III Інтэрнацыянал».

Мы, калгаснікі калгаса «III Інтэрнацыянал», прымаем выклік калгаснікаў калгаса «Першае мая». План лесавывазкі мы выканалі на 40 проц. і абавязваемся скончыць лесазагатоўкі і вывазку да 15 лютага.

Мы, калгаснікі калгасаў «Першае мая» і «III Інтэрнацыянал», патрабуем ад работнікаў сельсовета і леспрамгаса стварэння добрых умоў для работы ў лесе і практычнай дапамогі ў выкананні ўзятых абавязацельстваў.

Звяртаемся да ўсіх калгаснікаў Асіпавіцкага раёна і БССР шляхам сацыялістычнага спаборніцтва, стаханаўскіх метадаў работы закончыць план лесазагатовак і вывазкі не пазней 20 лютага. У адказ на дапамогу і клопаты партыі і ўрада і асабіста таварыша Сталіна, свае абавязацельствы мы выканаем поўнасцю ва ўказаныя тэрміны. Заклікаем усе калгасы, усіх калгаснікаў паследаваць нашаму прыкладу.

Пісьмо прынята на агульных сходах калгаснікаў калгаса «Першае мая» і «III Інтэрнацыянал», Лапіцкага сельсовета, Асіпавіцкага раёна.

Па даручэнню схода пісьмо падпісалі:

ЖУК Радзіон, ШПАК Павел, ГУРСКІ Антон, ЗАГАРОЎСКІ Віктар, ГЕРАСІМЧЫК Нікіфар, РАМАНОЎСКІ Фёдар, НОВІКАЎ Нічыпар, НАЛІВАЙКА Кастусь, ЯЦЫНА Франц, ЦІШКЕВІЧ Міхаіл.

ЗА ПЕРАХОДНЫ СЦЯГ НАРКАМАТА АБАРОНЫ

Рыхтуючыся да гістарычнага 20-годдзя РСЧА і Ваенна-Марскога Флота, Белдзяржкіно абавязалася закончыць і выпусціць у 1938 годзе дзве вялікія абарончыя карціны: аб барацьбе Чырвонай Арміі з беларускай акупацыяй на Беларусі — «11 ліпеня» (рэж. Тарыч) і «Вогненыя гады» (рэж. Наўроцкі); падрыхтаваць у гэтым годзе пастаноўку карціны аб Чырвонай Арміі нашых дзён.

У парадку непасрэднага ўключэння ў шэфскую работу, Белдзяржкіно і Саюз кіно-фотаработнікаў абавязаўся таксама ў дні святкавання 20-годдзя РСЧА ва ўсіх кінатэатрах арганізаваць кіноранішнікі для байцоў гарнізона — 24 лютага, і ў кінатэатры «Чырвоная зорка» — вячэрні сеанс для начальствуючага склада і яго сем'яў. Будуць арганізаваны выезды гукавых кіноперасовак у часці.

Для сістэматычнага абслугоўвання байцоў у выходны і перадвыходны дні кінатэатрамі горада («Чырвоная зорка» і «Пролетарый») прадстаўлена па 15 месц на першы сеанс.

Для абслугоўвання байцоў уводзіцца ў практыку сістэматычны кіноранішнік у гарадскіх кінатэатрах кожны выходны дзень.

Белдзяржкіно абавязалася аказаць дапамогу ДЧА ў правядзенні кінафестываля для камплектавання падборам і выпускам кінакарцін, з прыцягненнем узельнікаў пастаноўкі гэтых карцін.

Для ажыццяўлення намечаных практычных мерапрыемстваў калектыў Белдзяржкіно ўключыўся ў сацыялістычнае спаборніцтва на атрыманне пераходнага сцяга Наркамата абароны СССР.

ПРА АТЭСТАЦЫЮ НАСТАЎНІКАЎ

В. І. ПІВАВАРАЎ
Нарком асветы БССР

Атэстацыя настаўніцтва, якая праводзілася раней, была скарыстана ворагамі народа для выгнання з радоў настаўніцтва лепшых настаўнікаў совецкай школы, асабліва моладзі і комсамольцаў, была скарыстана для захавання ў радах настаўніцтва антысовецкіх, трацкісцка-зіноўеўскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, а таксама для выскрэбтацыі атэстацыі і выкліку незадавалення сярод нашага совецкага настаўніцтва.

Ворагамі, праводзіўшымі атэстацыю, з пэўнай мэтай не былі прысвоены званні настаўнікам - комсамольцам, маючым закончаную педагагічную асвету і вялікі стаж педагагічнай работы: І. І. Стрыкель, Э. М. Шкляр, Х. І. Шашкова (Слуцкі раён); выкладчыкам мовы Шчэрбачэнко М. Т. (Любаньская НСШ), Лісоўскай (Орша, педстаж 25 год). Старавойтавай (дырэктар Панізоўскай НСШ) і іншым. Ворагі выганялі з радоў совецкага настаўніцтва комуністаў, комсамольцаў, настаўнікаў, у якіх вялікі педагагічны стаж, якія маюць вопыт і жаданне працаваць.

Па Петрыкаўскаму раёну былі адхілены «па непрыгоднасці» 44 чалавекі, у тым ліку 6 комсамольцаў, 1 член партыі; па Дрысенскаму раёну — 19 чалавек, у тым ліку 5 комсамольцаў; па Тураўскаму раёну — 12 чалавек і т. д. Характэрны прыклад з т. Шкляр Э. М. Яна працуе ў школе чацверты год, з'яўляецца камсоргам школы, скончыла педагагічную навучальную ўстанову, займалася на другім курсе ВДУ (завочна), добрая грамадская працаўніца, яна жадае палепшыць становішча справ у школе. І яе не атэставалі, імкнуліся выгнаць з радоў совецкага настаўніцтва. У гэты-ж час пакідаліся ў школах яўна варожыя людзі, якім ні ў якім разе нельга было давяраць навучання і выхавання совецкіх дзяцей у комуністычным духу.

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР ад 10 красавіка 1936 года аб парадку ўвядзення персанальных званняў для настаўнікаў пачатковых і сярэдніх школ адзначыла: «Совецкае настаўніцтва вырасла ў магутную культурную сілу, вылучыўшы з сваіх радоў настаўнікаў, якія добра валодаюць педагагічным майстэрствам і паказваюць узоры ў справе навучання і ленінскага выхавання падрастаючага пакалення». Гэтай пастановай партыя і ўрад падкрэсліваюць усё ўзрастаючую ролю і адказнасць настаўніка за навучанне і выхаванне дзяцей. Пастанова абавязала Наркамасветы саюзных рэспублік прысвоіць высокае званне сапраўды народным настаўнікам і пазбавіць гэтага высокага звання выпадковых людзей, якія не адпавядаюць патрабаванням педагагічнай работы. Гэту пастанову зарагі народа, якія арудвалі ў Наркамасветы БССР, прабавалі сарваць. На чале атэстацыйных камісій часта стаялі людзі, якіх шкоднікі з Наркамасветы ставілі мэтай разагнаць кадры настаўнікаў, аслабіць фронт народнай асветы.

У мэтах ліквідацыі вынікаў шкодніцтва ў справе правядзення атэстацыі настаўнікаў Наркамасветы БССР, па ўказанню партыі і ўрада, з 1 лютага гэтага года прыступіў да перагляду спраў школьніка правядзенай, а ў некаторых раёнах і зусім не праведзенай, атэстацыі настаўнікаў. У кожным раёне стараюцца атэстацыйныя камісіі з лепшых, праверэных настаўнікаў. Атэстацыя настаўнікаў і прысваенне персанальных званняў народнага настаўніка ставіць сваёй мэтай яшчэ вышэй падняць ролю народнага настаўніка ў справе комуністычнага выхавання і навучання нашай ізетвары.

Толькі ў краіне Советаў, дзе партыя, совецкая ўлада і асабіста таварыш Сталін няўтомна і штодзённа адчуюць увагу нашаму настаўніку, ён мог дасягнуць такой вышыні, на якой не можа стаяць настаўнік ні ў адной з капіталістычных краін.

У сучасны момант у 7 тысячах школ БССР працуе 30300 настаўнікаў, якія навучаюць 1.011 тысяч дзяцей. Гэтыя лічбы гаворыць аб велізарным росце дабрабыту і культуры нашай краіны, дасягнуўшай гэтых вынікаў дзякуючы перамозе социялізма ў СССР, дзякуючы таму, што кіруе нашай краінай комуністычная партыя на чале з нашым любімым правадыром таварышам Сталіным.

Сярод шматлікай арміі работнікаў народнай асветы мы маем тысячы энтузіястаў сваёй справы, верных сыноў нашай радзімы, якія чэсна і аддана працуюць на карысць народа. Мы маем такіх настаўнікаў, як А. Г. Шіхоня (Дрысенскі раён), Пракоф'еў і Агеев (Горкаўская НСШ), Калпакова, Вольскі, Каняхін (Сталінская НСШ), Дземізенка (Узян'янаўская НСШ), Галіцкая, Прэйс, Гарбачоў (Добрушскі раён), Шышкова, Варцінская, Копкіна (Барысаў), Бадзюля (Чырвонаслабодская НСШ) і інш., якія дабіліся высокага пропанту паспяховасці.

Настаўніцкія канферэнцыі, праведзеныя па ўсіх раёнах БССР у канцы першага паўгоддзя, прайшлі на высокім палітычным узроўні. Яны паказалі, што абсалютная большасць настаўнікаў бязмежна аддана сваёй социялістычнай радзіме, справе комуністычнага выхавання. Многія школы дабіліся, у выніку авалодання настаўнікамі педагагічным майстэрствам, рыдатных рэзультатаў у справе выхавання дзяцей.

Побач з гэтым мы маем рад школ, амаль у кожным раёне, дзе справы абстаюць дрэнна, дзе паспяховасць нізкая, дзе выхаваўчая работа ў загоне, дзе адсутнічае працоўная дысцыпліна, а сярод настаўнікаў маюць месца склокі і няма ніякай палітычна-асветнай работы. Характэрна, што там, дзе адсутнічае палітычна-выхаваўчая работа, там нізкая паспяховасць, дрэнная дысцыпліна.

У радзе раёнаў атэстацыя настаўнікаў зусім не была праведзена, і тут яе неабходна пачынаць нанава. У астатніх раёнах неабходна прывесці ў парадак матэрыялы ранейшых атэстацыйных камісій. Калі пры гэтым ёсць ці паступяць апеляцыі ці ўзнікнуць сумненні адносна асобных людзей, гэтыя матэрыялы патрэбна будзе праверыць на месцы ў школе. Асноўная задача атэстацыі заключаецца ў тым, каб замацаваць вопыт майстраў педагагічнага працэсу, дапамагчы маладым настаўнікам працаваць над сабой і павышаць дзелавую і палітычную падрыхтоўку. Гэта павінна яшчэ больш рашуча палепшыць работу школ, яшчэ больш прыцягнуць увагу нашага настаўніцтва да таго, каб комуністычнае выхаванне было адрыўным ад навучання дзяцей. Урок— асноўны і галоўны сродак комуністычнага выхавання ў школе. Тыя настаўнікі, якія авалодваюць большэвізмам, узнімаюць свой палітычны ўзровень, прымаюць актыўны ўдзел у жыцці нашай краіны ёсць сапраўдныя народныя настаўнікі, здольныя выхоўваць нашых дзяцей у комуністычным духу.

Праводзячы атэстацыю, асаблівую ўвагу мы павінны звярнуць на якасць работы. Папярэднія вынікі першага семестра 1937—38 навучальнага года паказваюць, што паспяховасць у многіх школах яшчэ на вельмі нізкім узроўні. Па Веткаўскаму раёну ў 8-х класах паспяховасць складае 36 проц. Нізкая паспяховасць па школах г. Барысава. У пятых класах сярэдняй школы № 6 паспяховасць складае 34 проц., па 7-х класах — 44 проц. У сярэдняй школе № 8 у 7-м класе паспяховасць — 35 проц., а ў 9-м — 40 проц.

У многіх школах вельмі вялікі пропант другагодніцтва. Так, у Пухавіцкім раёне асталося на другі год 16 проц. дзяцей. Вынікі школьніцкай дзейнасці ў гэтай галіне ліквідуюцца марудна.

Атэстацыйныя камісіі, раённыя аддзелы народнай асветы павінны мабілізаваць увагу настаўніцтва на тое, каб з нізкай паспяховасцю, другагодніцтвам пакончыць у другой палове навучальнага года.

З боку раённых арганізацый увага справе народнай асветы яшчэ вельмі незначная. Не выпадкова таму па мясцовому бюджэту на народную асвету асталіся вялікія нескарыстаныя сумы грошай у мінулым годзе, у той час як школьныя бібліятэкі ўкамплектаваны дрэнна, абсталяванне некаторых школ устарэла, і т. д. У радзе раёнаў (Заслаўскі, Лёзненскі, Старадарожскі) школы асталіся на зіму без дроў. Старшыні райвыканкомаў, загадчыкі райана не займаюцца пытаннямі работы школ.

Галоўнейшая задача совецкага настаўніцтва — хутчэйшая ліквідацыя вынікаў шкодніцтва, навядзенне большэвіцкага парадку ў школах і ачыстка настаўніцкіх радоў ад негодных людзей. Мы павінны пакласці ў аснову ўсёй сваёй работы ў школе пастанову студзеньскага Пленума Сталінскага Цэнтральнага Камітэта нашай партыі.

Мы маем рад выпадкаў няправільнага знятця з работы настаўнікаў. Наркамасветы толькі за студзень скасаваў 44 загады раённых аддзелаў народнай асветы і алнавіў на рабоце 44-х педагогаў. Часта варожыя людзі на часных настаўнікаў узводзяць паклёп. Напрыклад, у рэдакцыю газеты «Піонер Беларусі» быў выслан матэрыял, аб дырэктару Рудне-Барталамееўскай школы, Чачэрскага раёна, т. Пуплікавай А. В. і загадчыку вучэбнай часці Сцябловай Е. Л., якія абвінавачваліся ў антысовецкай агітацыі. Пры расследаванні аказалася, што гэта была правакацыйная хлусня варожага нам чалавека.

Праводзячы атэстацыю трэба звярнуць увагу ўсяго настаўніцтва на тое, што сярод настаўнікаў многа яшчэ людзей малапісьменных, асабліва па рускай мове. Немагчыма далей безуважна праходзіць міма гэтага. Не паслабляючы ўвагі да павышэння пісьменнасці па беларускай мове, настаўнікі павінны вывучаць рускую мову, дабівацца карэннага паляпшэння выкладання рускай мовы ў нашых школах. У гэтых адносінах Наркамасветы намецілі, апрача другіх мерапрыемстваў, перападрыхтоўку настаўнікаў па рускай мове ў летні час.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР для скарачэння атэстацыі настаўнікаў вызначылі тэрмін 2 месяцы. Гэта накладае на Наркамасветы, раённыя аддзелы народнай асветы, на настаўніцтва і ўсе раённыя арганізацыі адказныя задачы. Трэба ў самы кароткі тэрмін прывесці ў поўны парадак асабістыя справы настаўнікаў. Неабходна рашуча наладзіць учот, які ў Наркамасветы і ў райана амаль адсутнічае; стварыць тэхнічны апарат у дапамогу атэстацыйным камісіям.

Задача партыйных арганізацый, райвыканкомаў, комсамола заключаецца ў тым, каб умацоўваць органы народнай асветы, забяспечваць кожную школу ўсім неабходным для яе нармальнай работы, дапамагаць атэстацыйным камісіям праводзіць атэстацыю, гэтае важнейшае мерапрыемства партыі і ўрада па ўмацаванню совецкай школы.

Да XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. НА ЗДЫМКУ: байцы Н-скай часці Маскоўскай ваеннай акругі на зімовых тактычных занятках. Фото Е. Еўзерыхіна (СФ).

НАСУСТРАЧ XX ГАДАВІНЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ВАЕННА-МАРСКОГА ФЛОТА

ВЫСТАЎКІ

ГОМЕЛЬ. Асоавіяхімаўцы горада рыхтуюць дастойную сустрэчу выдатнаму юбілею Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. На прадпрыемствах горада каля тысячы чалавек трэніруюцца да здачы норм на значок «Варашылаўскі стралок». 425 чалавек з камбіната «Спартак», Гомсельмаша і электрастанцыі рыхтуюцца да залікаў на значок ППХА. Праходзяць спаборніцтвы паміж стралкамі прадпрыемстваў і школ. Лепшых вынікаў дабіліся — вучань 7-й школы Кабашнікаў, які выбіў 48 ачкоў з 50 магчымых і вучань 5-й школы Футэрман — 45 ачкоў з 50 магчымых.

Днямі пры горсовеце Асоавіяхіма арганізуюцца 10-дзённыя курсы кіраўнікоў стралковых гурткоў.

Паміж дапрызыўнікамі разгортваецца соцыялістычнае спаборніцтва за лепшыя паказчыкі ў баявой і палітычнай вучобе.

Бюро гаркома КП(б)Б зацвердзіла мерапрыемствы па падрыхтоўцы і правядзенню свята. Дом партактыва рыхтуе выстаўку, прысвечаную 20-годдзю Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Такія-ж выстаўкі арганізуюцца на большасці прадпрыемстваў горада.

Вывучэнне гісторыі грамадзянскай вайны

РЭЧЫЦА. Узмоцнена рыхтуюцца да XX гадавіны Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота на запалкавай фабрыцы «Х Кастрычнік». У пэхах і інтэрнатах праводзяцца гутаркі аб гістарычным шляху барацьбы і перамог Чырвонай Арміі, вывучаецца гісторыя грамадзянскай вайны. Для правядзення гэтай работы вылучаны 30 лепшых агітатараў фабрыкі.

Шырока разгарнулася абаронна-фізкультурная работа. Арганізаваны стралковыя каманды, гурткі ППХА і ГПА. Днямі брыгада рабочых фабрыкі выехала ў палешэфны калгас. Пасля даклада аб XX гадавіне РСЧА адбыўся паказ мастацкай самадзейнасці.

21 лютага будзе праведзена лыжная эстафета, прысвечаная XX гадавіне Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. У эстафеце прымуць удзел 20 лепшых фізкультурнікаў фабрыкі. Удзельнікі эстафеты азнаёмяць калгаснікаў з гісторыяй грамадзянскай вайны.

Калгас «Чырвоны сцяг», Хойніцкага раёна, добра арганізаваў работу па рамонту сельскагаспадарчага інвентару. НА ЗДЫМКУ: стаханавец-калгаснік Г. А. Карась за рамонтам калёс. Ён штодзённа выконвае план рамонту на 250 проц. Фото Я. Гаравога (БСФ).

СТРАЛКОВЫ КЛУБ

МАГІЛЕЎ. 38 стралковых камандаў горада ўзмоцнена рыхтуюцца да завочных стралковых спаборніцтваў. Першага лютага адкрыўся гарадскі стралковы клуб. Тут пяцёр правоўзіцца здача норм на значок. «Варашылаўскі стралок».

Да выхатнага юбілею Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота асоавіяхімаўскія арганізацыі рыхтуюць 50 варашылаўскіх коннікаў, сярод іх 10 комсамолак. Заняткі праходзяць пад кіраўніцтвам вопытных кіраўнікоў. Моладзь праяўляе вялікую зацікаўленасць да гэтага віда спорта.

Горсовет Асоавіяхіма падрыхтаваў без адрыву ад вытворчасці 18 інструктароў стралковага спорта і 25 інструктароў ППХА.

СУСВЕТНЫ РЭКОРД ШТАНГІСТА НАУМАВА

У Ленінградзе адбыўся традыцыйны матч паміж камандамі штангістаў Масквы і Ленінграда. У гэтым матчы па-за конкурсам прымаў удзел пяжкаатлёт БССР тав. Наумаў, які ўстанавіў сусветны рэкорд па штанзе.

У жыме двума рукамі для поўцяжкай вагі Наумаў выжаў 119 кілограмаў, пабіўшы сусветны рэкорд Хапімскага (Кіеў) — 118 кілограмаў.

Тав. Наумаў працуе трэнерам пяжкаатлётнай школы ў Віцебску і з'яўляецца членам спартыўнага таварыства «Спартак».

СУД

ЗА РАСКРАДАННЕ ДЗЯРЖАЎНЫХ СРОДКАЎ — РАССТРЭЛ

Судовая Калегія Вярхоўнага Суда БССР пад старшынствам тав. Тапырына разглядзела справу аб раскрадванні дзяржаўных грошай у Цэнтральнай менскай гасцініцы «Еўропа». Суд устанавіў, што былы памочнік бухгалтара гэтай гасцініцы Станкевіч М. М., пачынаючы з 1935 года, займалася раскрадваннем і прысваеннем дзяржаўных грошай. Прымаючы ад зменных касіраў выручку, яна частку грошай замест здачы ў банк прысвайвала. Каб скрыць сляды злачынства, падсудная сістэматычна знішчала бухгалтарскія дакументы. Усяго яна раскрала 95.899 рублёў дзяржаўных грошай.

Былы галоўбух гасцініцы «Еўропа» Смалянскі Ш. замест кантролю і праверкі ўліку і правільнасці здачы грошай злачынна адносіўся да выканання сваіх прамых абавязкаў. Гэта дало магчымасць Станкевіч на працягу раду год рабіць свае злачынствы.

Судовая Калегія Вярхоўнага Суда БССР прыгаварыла: Станкевіч М. М. да вышэйшай меры сацыяльнай абароны — расстрэлу, з канфіскацыяй асабіста ёй належачай маемасці. Смалянскі Ш. прыгавораны да пазбаўлення волі ў папраўча-працоўных лагерах НКВД у аддаленых мясцовасцях тэрмінам на 3 гады.

Станкевіч Ч. па суду апраўдан.

І. МІН.

У СОВЕЦЕ ЛІГІ НАЦЫЙ

СКОНЧЫЛА РАБОТУ СЕСІЯ „КАМІТЭТА 28-мі"

ЖЭНЕВА, 2 лютага. (БЕЛТА). «Камітэт 28-мі», які разглядае пытанні перагляду статута Лігі, сёння на заключным пасяджэнні прыняў тэкст даклада аб сваёй рабоце для прадстаўлення наступнаму пленуму Лігі нацый.

У заяве «па матывах галасавання» Ундэн (Швецыя) падкрэсліў, што калі швецкаму ўраду прыдзецца на практыцы прымаць рашэнне аб прымяненні 16-га артыкула статута Лігі нацый аб сумесных мерапрыемствах супроць агрэсара, то ён будзе лічыць сябе свабодным ад безумоўнага абавязацельства прымяняць эканамічныя і фінансавыя санкцыі. Аналагічную заяву зрабіў Вальдэс Мендэвіль (Чылі). Пры гэтым ён пайшоў яшчэ далей і сказаў, што гэта адносіцца таксама да «Лігі нацый наогул».

У заключнай прамове старшыня камітэта падкрэсліў, што «ідэалогія Лігі — гэта павага да закона і прывязанасць да міру». Гэтай заяве тут аддаюць асаблівае значэнне.

На гэтым сесія «Камітэта 28-мі» закрылася.

Прынята рэзалюцыя па кітайскаму пытанню

ЖЭНЕВА, 2 лютага. (БЕЛТА). Сёння на адкрытым пасяджэнні Совета Лігі нацый была прынята рэзалюцыя па кітайскаму пытанню, змест якой ужо паведамляўся (гл. «Звязду» ад 3 лютага).

Пасля таго, як рэзалюцыя была зачытана, першы дэлегат Кітая Велінгтон Ку ўказаў, што зараз японцы маюць у Кітаі каля мільёна салдат і што барацьба з японскай агрэсіяй вядзецца на 6 франтах.

— Усе падзеі апошняга часу,—падкрэсліў Велінгтон Ку,—пацвярджаюць тэзісы славутага «мемарандума Танакі», сапраўднасць якога ў свой час аспрэчвалася японскім прадстаўніком у Лізе нацый. Як вядома, у гэтым мемарандуме выкладаюцца захватніцкія планы Японіі — спачатку заваяваць Кітай, пасля Азію і, нарэшце, устанавіць японскае панаванне над усім светам.

Велінгтон Ку ўказаў, што кітайскі ўрад патрабуе ад Совета Лігі прыняцця адпаведных мер для абароны Кітая тым больш, што ні рэзалюцыя мінулага пленума Лігі нацый, ні Брусельская канферэнцыя не прывялі ні да якіх эфектыўных мер.

Пакуль японская агрэсія ў Кітаі беспакарана развіваецца, мір у Еўропе астаецца пад пытаннем, — сказаў Велінгтон Ку.

Прадстаўнікі Перу (краіна Паўднёвай Амерыкі) і Польшчы заявілі, што яны ўстрымліваюцца ад галасавання.

Дэлегаты Англіі, Францыі і СССР паведамілі, што прыватная нарада чатырох дзяржаў узнікла па просьбе кітайцаў, што выпрацаваны нарадай праект рэзалюцыі ніколькі не абавязвае Совет і што, ва ўсякім выпадку, гэтыя дзяржавы згодны на працягненне сесіі на які ўгодна тэрмін, каб тыя ці іншыя ўрады, уваходзячыя ў Совет, разглядзелі рэзалюцыю.

Велінгтон Ку затым узяў слова і агаласіў наступную дэкларацыю:

«Надзвычайная сур'ёзнасць становішча на Далёкім Усходзе патрабуе прыняцця Советам канкрэтных і энергічных мер. Рэзалюцыя, якая знаходзіцца перад Советам, сведчыць зноў аб сімпатыях, якімі была натхнёна рэзалюцыя пленума ад 6 кастрычніка 1937 года, — тым не менш, на наш погляд, яна недастатковая, каб адказаць неабходным патрабаванням моманту. Аднак я яе прымаю ад імя майго ўрада, будучы ўпэўнен, што ўказаннем вышэйпамянутай рэзалюцыі пленума будзе дан ход у большай меры, чым да гэтага часу.

Услед затым старшыня Совета канстатаваў, што рэзалюцыя прынята аднагалосна пры двух устрымаўшыхся, і абвясціў 100-ю сесію закрытай.

ПАВЕЛІЧЭННІ ПЕНСІІ ФРАНЦУЗСКІМ ДЭПУТАТАМ

ПАРЫЖ, 2 лютага. (БЕЛТА). Палата дэпутатаў 381 голасам супроць 161 прыняла рашэнне аб павелічэнні зарплаты дэпутатам з 60 тысяч франкаў да 82.500 франкаў у год. Камуністы галасавалі супроць гэтай пастановы.

Камуніст Грэза заявіў, што парламенцкая група компартыі галасуе супроць павелічэння зарплаты дэпутатам, паколькі дапамога прэстарэлым рабочым, стварэнне нацыянальнага фонда па беспрацоўю і прымяненне рухомай шкалы зарплаты для рабочых дагэтуль не ажыццёўлены.

АБМЕРКАВАННЕ „ХАРТЫІ ПРАЦЫ"

ПАРЫЖ, 2 лютага. (БЕЛТА). Парламенцкая камісія па пытаннях працы разглядзела ўрадавы праект «хартыі працы». Глава французскага ўрада Шотан выклаў урадавы праект, заявіўшы пры гэтым, што, у выпадку ўзнікнення глыбокіх разыходжанняў паміж урадам і камісіяй працы, ўрад паставіць перад парламентам пытанне аб даверы.

Комуністычныя дэпутаты Манмусо і Парсаль, члены камісіі, прынялі актыўны ўдзел у спрэчках.

Манмусо прапанаваў, каб у «хартыю працы» быў уключан пункт аб рухомай шкале зарплаты. Ён патрабаваў забароны непасрэднага найма рабочых прамыслоўцамі і адзначыў, што ў праекце не прадугледжана ніякіх санкцый супроць уладальнікаў, якія адмаўляюцца выконваць пастанову арбітража ці абвяшчаюць лакаут рабочых.

Парсаль у сваім выступленні патрабаваў, каб «хартыя працы» была распаўсюджана на сельскагаспадарчых рабочых.

Выступаўшы ад імя Усеагульнай канфедэрацыі працы Жуо прывёў шматлікія выпадкі парушэння ўладальнікамі прафсаюзных правоў рабочых і парушэнняў калектыўных дагавораў.

ПАЛІТЫЧНЫ КРЫЗІС У ГЕРМАНІІ

ПАРЫЖ, 2 лютага. (БЕЛТА). Французскі друк, паведамляючы аб прадстаячым уходзе ў адстаўку Бломберга з паста германскага ваеннага міністра, указвае на Герынга, як на яго магчымага прыемніка.

***

ВЕНА, 2 лютага. (БЕЛТА). Па паведамленню агенцтва «Юнайтэд Прэс» з Берліна, мяркуюць, што ў сувязі са зменай кіраўніцтва ваеннага міністэрства адбудуцца таксама вялікія змены ў камандаванні рэйхсвера (германскай арміі).

***

ПРАГА, 2 лютага. (БЕЛТА). Берлінскі карэспандэнт газеты «Вячэрне чэске слова» паведамляе, што ваенным міністэрствам будзе кіраваць сам Гітлер. Газета адзначае, што падзеі, якія адбываюцца ў Германіі, сведчаць аб глыбокім палітычным крызісе.

«Незадаволенне фашысцкім рэжымам,— піша газета, — з'яўляецца зараз у Германіі ўсеагульным».

ТТ. АСЕВЕДО І ДЖЭРМАНЕТО ВЫЕХАЛІ Ў БАБРУЙСК

Учора гасцяўшыя ў сталіцы БССР — старшыня Іспанскай секцыі МОПР'а тав. Ісідора Асеведо і член ПК компартыі Італіі, член Выканкома МОПР'а тав. Джэрмането выехалі ў Бабруйск.

У Менску тт. Асеведо і Джэрмането 2 лютага выступалі на мітынгах рабочых завода «Большэвік», фабрыкі «Комунарка».

Днём яны наведалі Палац піонераў і акцябрат, дзе гутарылі з дзецьмі. Тт. Асеведо і Джэрмането выбраны ганаровымі піонерамі і ім уручаны гальштукі са значкамі. Піонеры Менска прыднеслі гасцям альбомы і пісьмы для перадачы іспанскім і італьянскім піонерам.

Вечарам тт. Асеведо і Джэрмането прысутнічалі на інтэрнацыянальным вечары, наладжаным у іх гонар у Доме Чырвонай Арміі імя К. Е. Варашылава.

Тт. Асеведо і Джэрмането пасля Бабруйска наведаюць гарады Гомель, Магілеў, Віцебск.

АУТАМАШЫНЫ ДЛЯ БОЛЬНІЦ І ПОЛІКЛІНІК

Для палепшання абслугоўвання хворых на-даму менскі гарадскі аддзел аховы здароўя ў мінулым месяцы атрымаў 6 легкавых аўтамашын маркі «М-1». Гомель, Віцебск, Слуцк і Полацк для гэтай-жа мэты атрымалі па адной аўтамашыне. Апрача гэтага, чатыры легкавыя машыны накіраваны на слуцкую, полацкую, лепельскую і віцебскую санітарныя станцыі.

У бягучым квартале Наркамат аховы здароўя БССР атрымлівае 72 грузавыя машыны «ГАЗ». Гэтыя аўтамашыны будуць пераабсталяваны ў карэты хуткай дапамогі. Яны накіроўваюцца ў больніцы гарадоў, раёнаў і сельскіх мясцовасцей БССР.

—О—

БУДАЎНІЦТВА НОВЫХ КІНОТЭАТРАЎ

Упраўленне па справах мастацтваў пры СНК БССР намеціла праграму новага будаўніцтва і рамонту тэатраў і кіно.

Вясной закончацца будаўнічыя работы і пачнецца эксплаатацыя летняга гукавога кінотэатра ў менскім парку культуры і адпачынку. Да гэтага часу таксама будзе закончана будаўніцтва новага кінотэатра ў Полацку. У Бабруйску будзе зроблен капітальны рамонт будынку гарадскога тэатра і прыступлена да будаўніцтва новага кінотэатра на 600 месц.

Усяго на тэатральнае будаўніцтва сёлета намечана выдаткаваць каля 3 мільёнаў рублёў. (БЕЛТА).

—О—

НА ПРЫЗ РЭСПУБЛІКІ

1 студзеня на менскім стадыёне Дынама імя Кірава адбыліся даве сустрэчы па хакею на прыз БССР паміж камандамі: «Спартак» (Менск) — «Спартак» (Бабруйск) і камандамі інстытута фізкультуры (Менск) — «Спартак» (Гомель).

Сустрэчы закончыліся перамогай каманд Менска з лікам «Спартак» (Менск)—«Спартак» (Бабруйск) 10:0 і інстытут фізкультуры (Менск) — «Спартак» (Гомель) — 5:1.

—О—

НАРАДА ПА ПЫТАННЯХ БУДАЎНІЦТВА Ў 1938 ГОДЗЕ

адбудзецца 4 лютага, у 19 гадзін, у рэдакцыі «Звязды» (Совецкая, 63, 3-ці паверх).

На нараду запрашаюцца прадстаўнікі: Дзяржплана БССР, Наркомгаса, Наркаммясцпрома, Наркамасветы, Наркамата аховы здароўя, Промпраекта, Белдзяржпраекта, Саюза архітэктараў, Промбудтрэста, Белкомунбуда, Менбуда, Цагельна-чарапічнага трэста № 1, Вяжнерудтрэста, Дзяржбудканторы, Менскага горсовета, прадстаўнікоў новабудоўляў: Вялікага тэатра, гасцініцы, Дома Акадэмі навук і інш. Запрашаюцца стаханаўцы будоўляў і цагельных заводаў.

Просьба да ўсіх таварышоў прыйсці на нараду з падрыхтаванымі матэрыяламі па ўсіх пытаннях будаўніцтва, будаўнічых матэрыялаў і будаўнічага праектавання.

ЗДАРЭННІ

Гэтымі днямі група хлопчыкаў — каля 8 чалавек — падчапілася на падножку трамвая першай лініі. Калі трамвай праходзіў па масту каля электрастанцыі, па Совецкай вуліцы, дзеці, якія віселі на падножцы, ударыліся аб борт стаяўшай на масту аўтамашыны, абарваліся і ўпалі. 4 хлопчыкі атрымалі ўшыбы. Адзін з іх — Гінтоў К., 14 год, знаходзіцца на вылячэнні ў Клінічным гарадку, а трое— Валодзька В., Іўкін В. і Ціркевіч — былі дастаўлены ў першую больніцу, дзе ім аказана медыцынская дапамога.

ДЗЕННІК

— Заняткі семінара партактыва адбудуцца 5 лютага ў 10 гадзін раніцы ў доме партактыва.

Намеснік адказнага рэдактара І. М. ОФЕНГЕЙМ.

Кінотэатр „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"

Ад 4 лютага

НОВЫ ВЯЛІКІ ГУКАВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ

Сцэнарый і пастаноўка рэжысёра бр. ВАСІЛЬЕВЫХ

Вытворчасць ордэнаноснай кінастудыі Ленфільм.

Пачатак сеансаў: 5, 7, 9 і 11 г. веч.

Каса адкрыта ад 11 г. раніцы.

У АДДЗЕЛ АБ'ЯЎ ЗВАНІЦЕ ПА ТЭЛЕФОНУ 21-845

ДЗЯРЖСТРАХ СССР

ВА ЎСІХ ГАРАДАХ І СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ СОВЕЦКАГА САЮЗА ІНСПЕКТАРЫ І СПЕЦЫЯЛЬНЫЯ АГЕНТЫ ДЗЯРЖСТРАХА ПРЫМАЮЦЬ

ДОБРААХВОТНАЕ СТРАХАВАННЕ ХАТНЯЙ МАЕМАСЦІ.

Можа быць застрахавана:

АБСТАНОЎКА, АДЗЕННЕ, МУЗЫКАЛЬНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ, АЎТАТРАНСПАРТ і інш. ТАРЫФЫ ЗНАЧНА ПАНІЖАНЫ.

З кожнай 1000 рублёў у год уплачваецца:

У ГАРАДАХ І РАБОЧЫХ ПАСЕЛКАХ: у будынках каменных — 1 р., і будынках змешаных — 2 р., у астатніх будынках з агнетрывалым дахам — 2 р. 50 к. і з драўляным або саломеным дахам — 4 р.

У СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ: у будынках з агнетрывалым дахам — 6 р. і ў астатніх будынках — 9 руб.

ХАТНЯЯ МАЕМАСЦЬ МОЖА СТРАХАВАЦЦА БЕЗ АГЛЯДУ І СКЛАДАННЯ ВОПІСІ Ў МЕЖАХ НАСТУПНЫХ СУМ:

У ГАРАДАХ — для сямейных да 10.000 руб., а для адзінокіх да 6.000 р.

У СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЦЯХ — для сямейных да 5.000 руб., а для адзінокіх да 3.000 руб.

Для рабочых і служачых, якія пражываюць у сельскай мясцовасці, але не звязаны з вядзеннем сельскай гаспадаркі і не ўплачваюць сельгаспадатку, ужываюцца тарыфы, устаноўленыя для гарадоў.

ЗАСТРАХАВАЎШЫ СВАЮ МАЕМАСЦЬ, КОЖНЫ ГРАМАДЗЯНІН ГАРАНТУЕ ЯЕ АДНАЎЛЕННЕ Ў ВЫПАДКУ ГІБЕЛІ АД ПАЖАРУ АБО ІНШЫХ СТЫХІЙНЫХ БЯДОТ, ЗА КОШТ СРОДКАЎ ДЗЯРЖСТРАХА.

За ўсімі даведкамі і растлумачэннямі звяртацца ў гарадскія, раённыя страхавыя інспекцыі, а таксама ва ўпраўленне дзяржстраха НКФ БССР, тэл. 22-060.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА НКФ БССР

4 ЛЮТАГА, У 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА, У ПАМЯШКАННІ ДОМА ПАРТАКТЫВА (рог вул. Карла Маркса і Энгельса)

адбудзецца

ПАСЯДЖЭННЕ ПЛЕНУМА МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА СОВЕТА

ПАРАДАК ДНЯ:

1. Паведамленне аб рабоце першай Сесіі Вярхоўнага Совета СССР (дакл. тав. Ванееў).
2. Вынікі работы школ гор. Менска за першую палову і задачы школ на другую палову навучальнага года (дакл. тт. Іванішчанка, Жытковс, старшыня секцыі Нарас веты).
3. Арганізацыйныя пытанні.

Яўка членаў і кандыдатаў горсовета абавязкова.

ПРЭЗІДЫУМ ГОРСОВЕТА.

МЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЕДАГАГІЧНЫ ІНСТЫТУТ ІМЯ А. М. ГОРКАГА

абвяшчае ДАДАТКОВЫ НАБОР у аспірантуру

ПА НАСТУПНЫХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЯХ: беларускай мове, беларускай літаратуры, рускай мове, рускай літаратуры і зах. еўрапейскай літаратуры.

Тэрмін навучання ў аспірантуры — тры годы.

Паступаючыя ў аспірантуру павінны прайсці калоквіум.

Да калоквіума дапускаюцца грамадзяне ва ўзросце не звыш 35 год, якія маюць спецыяльную закончаную вышэйшую адукацыю. Прыём заяў да 7 лютага 1938 г. Калоквіум і залічэнне ў аспірантуру — з 7 па 15 лютага 1938 г.

Залічаныя ў аспірантуру забяспечваюцца стыпендыяй у размеры 400 руб. у месяц, іншагароднія — інтэрнатам.

Пры заяве прадставіць наступныя дакументы: падрабязную аўтабіяграфію, асабовы лісток па ўліку кадраў, пасведчанне, або дыплом аб вышэйшай адукацыі, навуковыя працы (калі такія ёсць), навуковыя водзывы, характарыстыку з месца работы і даведку аб стане здароўя.

Заявы накіроўваць па адрасу: г. Менск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой № 2-30, дырэктару менскага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага.

ДЫРЭКЦЫЯ.

Беларускі Дзяржаўны Драматычны тэатр

4 лютага Абан. № 104.

«БЕЗ ВІНЫ ВІНАВАТЫЯ»

Гукавы кінотэатр «Пролетарый»

ЗАПАРОЖАЦ ЗА ДУНАЕМ

Дзіцячы гукавы кінотэатр

АРСЕН

Кінотэатр «Навіны дня» (памяшк. дзіцячага кінотэатра)

1) Дзве дэмакратыі. 2) Паўночная Осецыя. 3) Свята ў тундры.

Гукавы кінотэатр «Інтэрнацыянал»

ПОЎНАЛЕЦЦЕ

Гукавы кінотэатр «Спартак»

КЛЯТВА

МЕНСКАМУ ПЕДІНСТЫТУТУ

патрэбны

на пастаянную работу

РАБОТНІКІ ВЕШАЛКІ І ПРЫБІРАЛЬШЧЫЦЫ.

Звяртацца па адрасу: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, пакой № 2-33.

ТРЭСТУ ЛЕСБЕЛ

патрэбны

ШОФЕРЫ для работы на лесавывазцы ў механізаваных пунктах і аўтабазах (на гэрыторыі БССР) на аўтамашынах ЗІС-5 і ЗІС-13

Звяртацца: гор. Менск, Дом Наркамлеса (Комсамольская вул.) трэст Лесбел, аддзел механізацыі.

Згублен пашпарт на каня завода безалкагольных напіткаў Трэста рэстаранаў і кафэ. Лічыць несапраўдным.

Дырэкцыя Белдзяржмедінстытута выражае сваё спачуванне аадгадчыку кафедры нармальнай фізіялогіі прафесару І. А. ВЕТОХІНУ з прычыны пасцігшага яго гора — смерці ЖОНКІ.

Дырэкцыя, партгрупа, камітэт ЛКСМБ і прафком менскага Белпедвучылішча з глыбокім жалем паведамляюць аб смерці студэнткі Белпедвучылішча

СТАРПОВІЧ Валенціны Пятроўны

паследваўшай з лютага 1938 года. Вынас цела з клуба Белпедвучылішча адбудзецца 4 лютага, у 4 гадзіны дня.

АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАВЕЦТВА: Менск, Совецкая 63. ТЭЛЕФОНЫ РЭДАКЦЫІ: рэдактара — 21-352, сакратарыята — 25-188, 20-830; аддзелаў: партыйнага — 21-353, совецкага будаўніцтва і гандлю — 22-412, прамысловага — 21-356, сельскагаспадарчага — 21-846, культуры — 23-955, мясцовай і замежнай інфармацыі — 25-189, аддзела пісем — 20-844, 21-899, 21-885, ілюстрацыйнага і стыльрэдактуры—21-556, аб'яў — 21-845.

Уп. Галоўлітбела № К—5430. Друкарня «Звязды», Менск, Совецкая, 63. Ю., Л., Б. 1.